МОСКВА 19
УЛ. МАРКСА ЭНГЕЛЬСА 14
ВСЕСОЮЗНОЙ БИБЛИОТЕКЕ
ИМ. ЛЕНИНА

Комуністычная партыя (бальшэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 119 (5793) | 26 мая 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыяты ўсіх краін, злучайцеся!

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**Прывітанне таварышам Сталіну, Молатаву, Варашылаву, Кагановічу, Калініну, Чубару, Мікаяну, Андрэеву, Касіору, Жданаву, Ежову, Рухімовічу, Межлаўку ад таварышоў Шмідта, Вадап'янава і Папаніна.**

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Рэгулярна склікаць актывы наркаматаў, глаўкаў і прадпрыемстваў.

**М. Вадап'янаў** — Наш чалёт на полюс.

**М. Т. Слепнёў** — Вялікі пералёт.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА: **А. Шавелько, А. Позняк, А. Магама** — Выраб вяжучых і новых матэрыялаў на базе мясцовай прамысловасці.

**Астроўскі** — Нецярпімае адставанне Асінторфа.

**І. ТУРЭЦКІ**—У палоне бюракратычных паперак.

**На партыйных канферэнцыях.**

Водгукі зарубежнага друку на перамогу совецкіх палярнікаў.

ЗА РУБЯЖОМ:

Прабыванне тав. Літвінава ў Жэневе;

Наступленне рэспубліканскіх войск у раёне Гвадалахары;

Адкрылася сусветная выстаўка ў Парыжы.

Адстаўка Балдуіна.

# Рэгулярна склікаць актывы наркаматаў, глаўкаў і прадпрыемстваў

Дырэктыва Пленума Цэнтральнага Камітэта партыі аб штомесячным скліканні актыва ў наркаматах, галоўных кіраўніцтвах, на чыгунках і прадпрыемствах была абмеркавана партыяй, у найшырэйшых колах беспартыйных рабочых і спецыялістаў і рэзалюцыі ўхвалай.

Ужо першыя сходы гаспадарчага актыва паказалі, якая гэта велізарная сіла для далейшага развіцця народнай гаспадаркі, для хутчэйшай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва япона-германскіх трацкісцкіх агентаў. Кіраўніцтва любым гаспадарчым прадпрыемствам настолькі ўскладнілася, абвязкі гаспадарнікаў настолькі расшырыліся, што справіцца з гэтай справай без дапамогі актыва, без яго падтрымання, проста немагчыма. Актыў дапамагае гаспадарніку сабраць усю творчую энергію і ініцыятыву найбольш падрыхтаваных і адданых справе комунізма людзей. На актывах заслухоўваюцца і абмяркоўваюцца даклады кіраўнікоў аб важнейшых рашэннях партыі і ўрада і кіруючых указаннях наркамата. Гэта—школа большэвіцкага выхавання нашых гаспадарчых кадраў.

«Узяць актывы ў гаспадарчых органах і на прадпрыемствах, прыцягнуць туды не толькі партыйных, але і беспартыйных актывістаў—адна з важнейшых задач паляпшэння нашай гаспадарчай работы, адна з верных гарантый далейшых сур'ёзных поспехаў. Хто з кіраўнікоў не зразуме гэтай большэвіцкай установкі, той апынецца ў хвосце падзей, апынецца ў полоне адсталых і абюракратыўшыхся гаспадарча-вытворчых актывы дапамогуць партыі хутчэй рушыць усю работу наперад, яны ўскрыюць многія прарэхі. Дапамогуць выкрыццю і знішчэнню трацкісцкіх і іншых шкоднікаў». (Молатаў).

Актывы акажуць спрыяючы ўплыў на ход работы прадпрыемстваў, трэстаў і іншых галін народнай гаспадаркі, калі яны будуць праводзіцца правільна, без адхілэнняў ўказанняў Пленума ЦК ВКП(б). Ёсць шмат сігналаў аб тым, што пашыраецца той мінімум абавязковых умоў, без якіх сутнасць, сэнс сходаў гаспадарчага актыва выпустошваецца.

Дрэнна арганізаван падбор удзельнікаў гэтых сходаў. Часта на актывы не запрашаюцца таварышы, якія могуць быць і карысны. Нядаўна адбываўся сход актыва Галоўнафты. Інтарэс да яго быў вялікі. Аднак, многа старых, вопытных інжынераў, працуючых у Галоўным кіраўніцтве нафтавай прамысловасці,—людзі, якім партыя і ўрад аказваюць палітычнае давер'е, даручаючы ім сур'ёзнейшыя ўчасткі работы,—на актыў не папалі. Ясна, што ад таго, хто будзе запрошан на сход актыва, у значнай ступені залежыць характар і карыснасць гэтага сходу. Старанны персанальны падбор удзельнікаў актыву — справа кіраўніка прадпрыемства, трэста, наркамата, і яна не можа быць падаверана трэцерадным работнікам.

Сходы актыва гаспадарчых органаў часта праходзяць неарганізавана, перапяраюцца ў шматтадзённыя, «доўгія парламенты». Той-жа актыў Галоўнафты працаваўся чатыры дні. І ўсё-ж кіраўнікі Галоўнага кіраўніцтва нафтавай прамысловасці, і ў першую чаргу тав. Барынаў, не зрабілі ні для сябе, ні для актыва неабходных вывадаў з рашэнняў ЦК і Наркома аб Данбасе, хаця парокі і спробы нафтавай прамысловасці ў аспоўным аналагічны таму, што ўскрыта ў Кірэшчыкаў.

Укорд працяжнасці сходу актыва парткома Уралмашзавод імя Орджанікідзе. Тут актыва аднаго толькі вытворчага адзела працягваўся з 21 красавіка па 4 мая. Гэта страшэнна, але факт! Чаму так доўга засяхаюць? Тлумачыцца гэта па-старому — частка гаспадарнікаў кіруецца хлусліва, зразуметай дэмакратыяй. Замест таго, каб кіраваць актывам, накіроўваць яго работу, усямерна заахвочваць здаровыя крытычныя заўвагі, падхопліваць каштоўныя прапановы і даваць адпор неправільным выступленням, якія часамі ідуць уразрэз з дырэктывамі партыі і ўрада, рэагаваць на прамовы асобных дэмагогаў, таварышы, якія ўзначальваюць тыя ці іншыя гаспадарчыя арганізацыі, занялі пазіцыю «нейтралітэта».

На актыве маскоўскага электразавода імя Куйбышэва выступіў нейкі Добрыян і заявіў, што «дырэктары заводаў, уваходзячыя ў сістэму электразавода, — кастраты». Абураючае заяўленне! Ніхто з кіраўнікоў схода не палічыў патрэбным спыніць дэмагога. Газета «Электразавод» у справаздачы аб актыве гэта заяўленне Добрыяна адзначыла, як удалае (?). Другая прычына, — неразуменне многімі, што азначае праводзіць сходы гаспадарчага актыва на высокім палітычным узроўні.

Баючыся абвінавачванняў у дзяльстве, некаторыя гаспадарнікі шарахаюцца ў другі бок. На актывах, дзе абмеркаванне пытанняў павінна насіць строга дзелавы характар, яны заахвочваюць палітычную траскатню, думаючы, што гэта ўзнімае ўзровень схода. Глыбокае заблуджэнне! Высокі палітычны ўзровень актыва забяспечваецца не палітычнай траскатнёй, а тым, як ажыццяўляюцца дырэктывы партыі, дырэктывы Пленума Цэнтральнага Камітэта, указанні таварыша Сталіна, тым, як у дакладах і прамовах, прапановах і крытычных заўвагах указваецца работа данага прадпрыемства, трэста, глаўка з агульнадзяржаўнымі задачамі.

У наркаматах, галоўных кіраўніцтвах розных галін народнай гаспадаркі, на прадпрыемствах праходзяць другі раз пасля Пленума ЦК сходы актыва. Выяўляецца, што каштоўнейшыя прапановы, якія былі ўнесены на папярэдніх сходах, не праведзены ў жыццё. Недахопы, ускрытыя тады-ж, да гэтага часу не ліквідаваны. З асаблівай наглядпасцю гэта можна бачыць у Данбасе. Калі-б каштоўныя прапановы, унесеныя на першых сходах актыва шахт, трэстаў, былі рэалізаваны, мы ўжо сёння, несумненна, мелі-б рэзкі ўздым адабычы вугалю ў Данбасе.

У Аральскім дзяржпараходстве некалькі дзён праходзіў сход, выступалі дзесяткі людзей. Прайшоў месяц, і нічога не зроблена. Такія адносіны да важнейшай дырэктывы Цэнтральнага Камітэта партыі нецярпімы! Сапраўдны большэвік-гаспадарнік ужо на другі дзень пасля схода актыва павінен рашуча прыняцца за ажыццяўленне тых прапаноў, з якімі ён згодзен, якія дапамагаюць рушыць справу наперад. Дзейснасць крытыкі, самыя ўважлівыя адносіны да прапаноў удзельнікаў схода, рашучая барацьба за іх ажыццяўленне — важнейшая ўмова большэвіцкага правядзення актываў. Інакш актывы ператворацца ў пустыя гаварыльні, што нанясе шкоду справе социялізма і адаб'е ахвоту ў спецыялістаў, стаханаўцаў наведваць гэтыя сходы.

Нельга не сказаць некалькі слоў і аб нашым друку. Нават многія цэнтральныя газеты не заўважылі, што дырэктыва Пленума ЦК аб актывах гаспадарчых арганізацый часта скажаецца. Газета «Легкая индустрия», захлёбваючыся, апісвала сходы актываў, якія працягваліся па некалькі дзён, з захапленнем паведамляла, што там прыняты доўгія рэзалюцыі.

Цэнтральны Камітэт партыі, таварыш Сталін нястомна вучаць гаспадарчых рабітнікаў прыслухоўвацца да голасу рабочых, служачых, спецыялістаў, да голасу людзей, у якіх ёсць каласальны жыццёвы і палітычны вопыт, якія надзвычай добра ведаюць тую галіну гаспадаркі, дзе яны працуюць. Актывы — адна з форм, бясспрэчна апраўдаўшая сябе, пастаяннага абмеркавання гаспадарчых кіраўнікоў з масамі, форма грамадскага кантролю мас. Правільнае большэвіцкае яе скарыстанне — зарука новых поспехаў і перамог усёй социялістычнай гаспадаркі.

*„Правда“.*

# Дэкада узбекскага мастацтва ў Маскве

У Маскве адкрылася дэкада узбекскага мастацтва. У першы дзень — 21 мая — на сцэне філіяла Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра Саюза ССР была паказана музыкальная драма «Гюльсара» ў пастаноўцы Узбекскага Дзяржаўнага музыкальнага тэатра.

Напружанае развіццё дзеяння, выдатна насычаныя жыццём масавыя сцэны, багацтвае афармленне пастаноўкі, мелодыі, на аснове якіх ляжыць народная творчасць — усё гэта вызначыла вялікі поспех спектакля «Гюльсара».

На спектаклі прысутнічалі таварышы Сталін, Молатаў, Калінін, Чубар, Анціпаў, Будзённы, Ікрамаў.

23 мая Узбекскі Дзяржаўны музыкальны тэатр паказаў музыкальную п'есу «Фархад» і Шырын». Злучэнне выдатнай акцёрскай игры, народнай музыкі, танцаў і прыгожага афармлення пастаноўкі стварылі незабыўнае яркае відовішча. Прысутныя на спектаклі таварышы Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Чубар, Мікаян, Анціпаў, Межлаук, Акулаў, Ікрамаў і Кержэнцаў горача апладыравалі артыстам.

## ВЕДАМА ДЭЛЕГАТАЎ IV МЕНСКАЙ ГАРАДСКОЙ КАНФЕРЭНЦЫІ КП(б)Б

Менгарком КП(б)Б паведамляе, што адкрыццё IV Менскай гарадской канферэнцыі КП(б)Б адбудзецца **31 мая г. г. у 6 гадзін вечара ў вялікай зале Дома** Саюзнага актыва.

**Парадак дня канферэнцыі:**

1. Справаздача аб рабоце Менгаркома КП(б)Б (**дакладчык тав. Хадасевіч**).
2. Справаздача рэвізійнай камісіі Менгаркома КП(б)Б (**дакладчык тав. Ананьев**).
3. Выбары Менгаркома КП(б)Б.
4. Выбары рэвізійнай камісіі Менгаркома КП(б)Б.
5. Выбары дэлегатаў на XVI з'езд КП(б)Б.

**Сакратар менгаркома КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.**

***

Выдача мандатаў дэлегатам канферэнцыі будзе праводзіцца 28, 29 і 30 мая з 8 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара, а 31 мая з 10 гадзін раніцы да 2 гадзін дня, у памяшканні Менгаркома КП(б)Б, у зале пасяджэнняў (Чырвонаармейская, вуліца, д. № 16).

Камандзір флагманскага карабля «СССР Н-170» Герой Совецкага Саюза тав. М. В. Вадап'янаў (справа) гутарыць з флагштурманам тав. І. Т. Спірыным на аэрадроме ў Хелмагорах перад адлётам на Паўночны полюс.

Фото А. Мяжуева (СФ).

*МАСКВА* — *З паўночнага полюса*

## Т. т. Сталіну, Молатаву, Варашылаву, Кагановічу, Калініну, Чубару, Мікаяну, Андрэеву, Касіору, Жданаву, Ежову, Рухімовічу, Межлаўку.

З непераўзваемымі радасцю і гордасцю выслухалі мы словы прывітання кіраўнікоў партыі і ўрада. Гэта — гордасць совецкіх людзей за сваю адзіўляючую краіну, за свае выдатныя самалёты, за нябачаныя ўмовы росквіту навукі і росту людзей.

Вы назвалі стварэнне станцыі на Полюсе «падвядзеннем выніку бліскучаму перыяду работы». Гэта совецкі перыяд даследвання і асваення Арктыкі, гэта той перыяд, калі Вы асабіста, таварыш Сталін, высунулі задачу асваення Поўначы, калі Вы асабіста ўказалі план і сродкі і нязменна прадаўжаеце падтрымліваць палярнікаў кіраўніцтвам і ўвагай. Няма большага пічасця, чым быць у сваёй галіне выканаўцам Вашых вялікіх ідэй, няма большай радасці і гордасці, чым атрымаць Ваша адабрэнне, наш дарагі правадыр і настаўнік.

**ШМІДТ, ВАДАП'ЯНАЎ, ПАПАНІН.**

## ПРЫВІТАННЕ ЦК КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ СОВЕЦКІМ ПАЛЯРНІКАМ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 25 мая (БЕЛТА). Орган компартыі «Юманітэ» публікуе сёння прывітанне Цэнтральнага Камітэта комуністычнай партыі Францыі совецкім лётчыкам, заваяваўшым Паўночны полюс.

«У гадзіну, калі фашысцкія самалёты Гітлера і Мусаліні, якія з'яўляюцца сімвалам вайны і варварства, сеюць смерць і жах у Герніцы і Гальдакано, — гаворыцца ў прывітанні, — совецкія самалёты, якія з'яўляюцца сімвалам міру і прагрэса чалавецтва, толькі што даказалі высокі ўзровень навукі і тэхнікі краіны социялізма, знізіўшыся ля Паўночнага полюса.

Прывітанне авіяцыі Совецкага Саюза, якая нясе на пераможных крылях трыумф чалавечага генія.

Прывітанне адважным вучоным і іх кіраўніку акадэміку Шмідту, з гонарам выканаўшым навуковую задачу на карысць усяму чалавецтву.

Прывітанне вялікай партыі большэвікоў, выхаваўшай людзей, гераізм якіх выклікае захапленне цывілізаванага свету.

Прывітанне таварышу Сталіну, пад кіраўніцтвам якога пераможны социялізм на адной шостай частцы зямнога шара пашырае свае грандыёзныя поспехі аж да палярных ільдоў».

## САГРЭТЫ КЛОПАТАМІ ВЯЛІКАГА СТАЛІНА

МАСКВА, ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА ПАЎНОЧНАГА МОРСКАГА ШЛЯХУ, ТАСС, «ПРАВДА», «ИЗВЕСТИЯ»

ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС, 24 мая, 19 гадзін (радыё).

Незвычайную карціну прадстаўляў учора ўвечары сход 13 членаў перадавога атрада экспедыцыі на крызе ля полюса, слухаўшых чытанне прывітальнай тэлеграмы кіраўнікоў партыі і ўрада. Сабраліся пад адкрытым небам, у пургу, але не адчувалі холаду, сагрэтыя яркімі словамі, хвалюючымі клопатамі вялікага Сталіна, адчуваючы гарачае дыханне любімай радзімы, паслаўшай нас.

Прадаўжаем працаваць. Вымералі таўшчыню крыгі, зрабіўшы проруб. Аказалася — тры метры. Крыга надзейная, вытрымае доўгі дрейф. Нясе нас пакуль па ветру на захад, лічачы ад мерадыяна Рудольфа, з хуткасцю да поўмілі ў гадзіну. Селі мы за полюсам, але ўжо к вечару дня пасадкі, 21 мая, аказаліся на 87 градусе заходняй даўгаты, 89 градусе 41 мінуце шыраты. У ноч на 23 мая заходняя даўгата—58 градусаў, шырата—89 градусаў 35 мінут. З таго часу не вызначаліся з-за адсутнасці сонца. Надвор'е пакуль не дазваляе прыляцець астатнім самалётам.

**О. Ю. ШМІДТ.**

## ВІНШАВАННЕ СТАРШЫНІ СОВЕТА МІНІСТРАЎ ІСПАНСКАЙ РЭСПУБЛІКІ ХУАНА НЕГРЫНА СОВЕЦКІМ ПАЛЯРНІКАМ

ВАЛЕНСІЯ. (Інф. «Правды»), 24 мая. У гутарцы з вашым карэспандэнтам з поводу адбыўшагося палёту совецкай экспедыцыі на Паўночны полюс старшыня совета міністраў, прафесар Негрын зрабіў наступную заяву:

«Для совецкіх людзей навукі, для акадэміка Шмідта, лётчыка Вадап'янава і другіх удзельнікаў экспедыцыі гэты вялікі поспех не быў выпадковасцю. Тыя велізарныя тэхнічныя і навуковыя дасягненні, якімі справядліва можа ганарыцца Совецкі Саюз, былі ажыццёўлены дзякуючы двум характэрным для совецкай навукі якасцям: дзякуючы духу адвагі і прадпрыймальнасці, у якім выхоўваюцца совецкія навуковыя работнікі, з аднаго боку, і дзякуючы сістэматычнай, планамернай падрыхтоўкі даследвання, што давядзіць да мінімума элемент выпадковасці.

Ва ўсім свеце няма ні адной дзяржавы, ні аднаго ўрада, якія аддавалі-б столькі матэрыяльных сродкаў, увагі і клопатаў навуковаму прагрэсу, як совецкая социялістычная дзяржава. У гэтым я, як удзельнік міжнароднага фізіялагічнага кангрэса ў Ленінградзе, меў магчымасць асабіста пераканацца. Можа быць, нават самі совецкія вучоныя і тэхнікі не ўяўляюць сабе ўсяго гістарычнага значэння сваіх заваяванняў, якія з'яўляюцца доказам невымаральнай культурнай перавагі социялістычнага ладу над капіталістычным.

Я горача віншую Совецкі Саюз з яго навейшай вялікай навуковай перамогай. Карыстаюся выпадкам, каб перадаць народам Совецкага Саюза выражэння глыбокай падзякі за тыя сімпатыі і падтрыманне, якія вялікі рускі народ аказвае іспанскаму народу. Мы добра разумеем, што наша барацьба за дэмакратыю, нацыянальную незалежнасць Іспаніі, супроць мяцежных генералаў, за спіной якіх стаяць фашысцкія дзяржавы, мае не толькі ўнутраны іспанскі характэр. Рэзультат гэтай барацьбы, у пераможным выходзе якой мы цвёрда ўпэўнены, будзе мець велізарнае станоўчае значэнне для міжнароднага міру і дэмакратыі. Мы разлічваем і надалей на дружбу і сімпатыі вялікага рускага народу».

У заключэнне гутарні проф. Негрын прасіў перадаць через «Правду» свае віншаванні і прывітанні ўсім удзельнікам экспедыцыі.

## ГАНАРЫМСЯ ГЕРАІЧНЫМІ ПАЛЯРНІКАМІ

ГОМЕЛЬ, 25 мая. (Кар. «Звязды»). Рабочыя завода Гомсельмаш з вялікай радасцю сустрэлі паведамленне аб тым, што адважныя людзі совецкай краіны заваявалі Паўночны полюс.

Партарганізацыя завода арганізавала калектыўнае чытанне матэрыялаў, змешчаных у «Правде» і іншых газетах, аб заваяванні Паўночнага полюса і людзях гераічнай экспедыцыі. Гэту работу праводзяць цэхавыя і зменныя палітбяседчыкі.

# Хутчэйшае сканчэнне сяўбы і пільны догляд за пасевамі— важнейшыя ўмовы павышэння ўраджайнасці

## МАЗЫРШЧЫНА СЯЎБУ ЯШЧЭ НЕ СКОНЧЫЛА

Мазырская акруга ганебна зацягнула веснавую сяўбу. Калгасы сеюць ужо каля двух месяцаў, а пасеялі па 20 мая толькі 70,7 проц. свайго плана. Што датычыць аднаасобнікаў, то яны выканалі свой план сяўбы ўсяго на 58,3 проц.

—Пакуль рана было сеяць проса і грэчку,—ад раённых і акруговых кіраўнікоў часта можна было пачуць.

— Нас цягнуць уніз познія культуры.

Але такія размовы з'яўляліся толькі шырмаю для апраўдання самацёку ў кіраўніцтве сяўбой і бяздзейнасцю зямельных органаў. Яркім доказам гэтага з'яўляецца хаця-б тое, што план веснавой сяўбы, выключаючы грэчку, выканан на 20 мая толькі на 88,3 проц. Гэта значыць, што па акрузе яшчэ недасеяна больш 10 тысяч гектараў розных яравых культур, апрача 28 тысяч гектараў грэчкі.

З другога боку, трэба адзначыць, што акруговае партыйнае і совецкае кіраўніцтва і дагэтуль яшчэ патурае «познім» настроям у пытаннях сяўбы грэчкі. Цёплае сонечнае надвор'е дазваляе разгарнуць масавую сяўбу позніх культур. Але большасць калгасаў акругі чагосьці чакаюць, не пачынаюць сеяць проса і грэчку. На 20 мая па акрузе проса засеяна 43,3 проц. плана, а грэчкі ўсяго 8 проц.

Асабліва ганебна зацягвае сяўбу Ельскі раён. Не гледзячы на сур'ёзнае папярэджанне гэтага раёна ЦК КП(б)Б і СНК БССР, кіраўнікі раёна для сябе неабходных вываданў па зрабілі. Агульны план сяўбы па раёну выканан толькі на 69.2 проц. Познія культуры—проса і грэчкі—займаюць у раённым плане сяўбы значнае месца, але сяўба іх фактычна яшчэ не разгорнута. Калгасы Ельскага. Розалюксембургскага, Багушэвіцкага і Кузьміцкага сельсоветаў зусім яшчэ не прыступілі сеяць грэчку.

**ФРАЛОЎ.**

## НЯМА КІРАЎНІЦТВА ПРАПОЛАЧНАЙ

Багаты ўраджай абяцаюць ільняныя палі калгаса «Шлях социялізма», Гарывецкага сельсовета, Сенненскага раёна. Яркa зелянеюць дружныя, роўныя ўсходы кучаравага лёну. Ён быстра падымаецца, і на некаторых участках вырас на 15 сантыметраў.

Але разам з усходамі лёну на палях з'явілася пустазелле. Ільнаводчыя звенні дружна выйшлі палоць у першую чаргу тыя часткі, дзе больш пустазелля.

Вось участак звяна Матруны Гарбачовай, з першай брыгады. Кожная калгасніца працуе на адведзеным загоне. Яны збіраюць у капы вырванае пустазелле і выносяць яго на далёкую аддалеласць ад пасеваў. Звеннявая Гарбачова пільна сочыць за якасцю праполкі.

У звяне Адэлі Лазарэвіч, з другой брыгады, таксама ідзе дружная работа па высокаякаснай праполцы лёну. Абодва звяны, як правядуць першую праполку, будуць падкормліваць лён калійнай соллю, аміячнай селітрай і фекаліем.

Ільнаводчыя звенні з вялікім запалам узяліся за праполку з тым, каб атрымаць у сярэднім па 7 цэнтнераў валакна з кожнага гектара, а на ўчастках плошчай па аднаму гектару — па 12 цэнтнераў. Аднак, трэба сказаць, што праўленне калгаса не надала належнай увагі правільнай арганізацыі работы на праполцы. Тут яшчэ многа недахопаў.

Асноўны недахоп гэта — празмерна вялікія звенні. У звяне М. Гарбачовай, напрыклад, працуе 13 жанчын, а ў звяне А. Лазарэвіч — 16. За кожным звяном замацавана па 11 гектараў лёну. Зразумела, што такая структура звенняў стварае немалыя цяжкасці ў рабоце звеннявых. Звеннявыя не ў сілах правільна расставіць людзей, аператыўна кіраваць іх работай і сачыць за якасцю праполкі. Гэта адрывае іх ад непасрэднага ўдзелу ў праполцы.

Празмерна вялікія ільнаводчыя звенні перашкаджаюць праполцы зернавых, бо ўсе або амаль усе жанчыны лічацца ў ільнаводчых звеннях, і зусім няма каму палоць зернавыя. Між тым, азімая пшаніца і іншыя зернавыя культуры маюць патрэбу ў неадкладнай праполцы.

Няправільна ўстаноўлены нормы выпрацоўкі і аплата працы. Праўленне калгаса без агульнага схода рашыла за кожную праполатую сотую гектара налічваць па 0,25 працадня. Такая ацэнка працы не спрыяе шырокаму разгортванню социялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху на праполцы. Наогул, на разгортванне спаборніцтва праўленне калгаса і брыгадзіры Гурэвіч і Лазарэвіч глядзяць, як не на патрэбную справу. З палольшчыцамі аб спаборніцтве ніхто і не гаварыў.

У калгасе вельмі спазніліся з адкрыццем дзіцячых ясляў. У першай брыгадзе яслі яшчэ не пачалі работу, і з-за адной дробязі, — ніяк не збіруцца прывезці ўрача для медыцынскага агляду дзяцей. У другой брыгадзе яслі адкрылі, але працуюць яны дрэнна. Даглядаць дзяцей тут даручылі старой 70 год. Безумоўна, што яна не ў сілах адна добра даглядзець дзяцей. Да таго-ж праўленне калгаса адпускае мала прадуктаў. У выніку — многія калгаснікі не жадаюць несці ў яслі сваіх дзяцей.

Калгас «Шлях социялізма» ў раёне лічыцца перадавым. Але чаму тут дрэнна арганізавана работа на праполцы? Адказ на гэтае запытанне можа быць адзін: райземаддзел (загалчык Падалякін) яшчэ не ўзяўся за кіраўніцтва праполкай. Калгас ад горада знаходзіцца за кілометр, а агранамаў на сваіх палях калгаснікі сустракаюць толькі ад выпадку да выпадку.

Відавочна, што ў аддаленых калгасах аграномы зусім не бываюць. Райземаддзел па-сур'ёзнаму абавязан узяцца за арганізацыю праполкі пасеваў, па-большэвіцку кіраваць работай звенняў.

**Ал. МАХНАЧ.**

## ВОРЫВА ПАПАРАЎ АДКЛАДВАЮЦЬ

Паводле плана калгасы Гроскага раёна павінны ўзараць у гэтым годзе 939 гектараў папару. Аднак, тут ворыва папараў адкладваюць на пасляпасеўны перыяд. «Закончым сеяць, тады пачнём ворыва папару, — разважаюць у райза, і з ворывам не спяшаюцца. Гэта пацвярджае той факт, што на 20 мая па калгасах раёна ўзарана не больш за 100 гектараў.

Многія калгасы яшчэ нават не пачыналі ворыва папару. Так, па калгасах Грозаўскага, Селіцкага і Пукаўскага сельсоветаў на 20 мая не ўзарана ні аднаго гектара.

Ворыва папараў асталося па-за ўвагай райземаддзела (загалчык т. Калешка) і машына-трактарнай станцыі (дырэктар т. Фёдараў). Гэтыя кіраўнікі рашылі пакуль што ворыва адкласці. Між тым лепшыя тэрміны для ворыва папару ўпушчаны.

**Г. СКУЦЗНЯ.**

## СОЎГАС ВЫШАЎ У ПЕРАДАВЫЯ

Соўгас «Усохі», Чэрвеньскага раёна, усе мінулыя гады ганебна адставаў па выкананню ўсіх сельскагаспадарчых работ. Соўгас лічыўся адным з адстаючых у раёне.

У гэтым годзе дзякуючы социялістычнаму спаборніцтву і стаханаўскаму руху веснавую пасеўную кампанію соўгас да 15 мая скончыў. На 35 дзён раней скончыў соўгас сяўбу супроць мінулага года.

За час пасеўнай кампаніі выраслі новыя стаханаўцы. Напрыклад, Бараноўскі Касперскі, Альховік, Касперская Марыя. Пракаповіч Аміля перавыконвалі нормы выпрацоўкі на 200 проц.

Зараз рабочы калектыў соўгаса пераключыўся на праполку і падрыхтоўку да сенаўборачнай кампаніі. Соўгас «Усохі» вышаў у перадавыя па Чэрвеньскаму раёну.

**В. МАКСІМОВІЧ.**

# НА ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ

## ЛЕПЕЛЬСКАЯ АКРУГА

**ЛЕПЕЛЬ, 24 мая.** На канферэнцыі была прынята рэзалюцыя па справаздачнаму дакладу тав. Ляхава аб рабоце акруг кома партыі. У сваёй рэзалюцыі канферэнцыя ацаніла практычную работу акруткома партыі нездавальняючай і адзначыла, што ў рабоце акруткома быў дапушчан рад грубых палітычных прарываў. Гэтыя прарывы, указаныя ў рэзалюцыі, з'явіліся рэзультатам адрыву кіраўніцтва акруткома ад шырокіх партыйных і працоўных мас.

Канферэнцыя таксама адзначыла, што ў рабоце акруткома партыі нелі месца нерашучасць і кволавочасовае рашэнне пытання аб выпампі з партыі ворага народу Шкотнікава.

Канферэнцыя ў сваёй рэзалюцыі намеціла рад практычных мерапрыемстваў для далейшай работы акруткома і партыйнай арганізацыі акругі, выходзячы з указанняў ЦК ВКП(б) і становішча партыйнай і гаспадарча-палітычнай работы ў акрузе.

Сёмы на канферэнцыі быў абмеркаваны кандыдатуры ў спіс для тайнага галасавання кандыдатаў у члены акруткома партыі. З высунутых 17 чалавек у рэзультаце абмеркавання асталося 13. Тайным галасаваннем абрана 7 чалавек.

Абраны дэлегаты на XVI з'езд КП(б)Б і рэвізійная камісія акруткома ў складзе 5 чалавек.

25 мая канферэнцыя закончыла сваю работу.

***

24—25 мая адбыўся арганізацыйны пленум ушоў абранага акруговага камітэта партыі. Закрытым тайным галасаваннем пленум аднагалосна абраў першым сакратаром акруткома партыі тав. Чэрнышова (працаваўшага раней сакратаром Бабруйскага райкома партыі). Другім сакратаром акруткома абран т. Тарасевіч (б. першы сакратар Ушацкага райкома партыі).

У склад бюро АК КП(б)Б закрытым тайным галасаваннем абрана 6 асоб у складзе: тт. Чэрнышова, Тарасевіча, Пушчыша, Разгонава, Ермалаева і Кавалёва.

Ц. ФРЫД.
Д. САДОЎСКІ.

## СЛУЦКАЯ АКРУГА

Хітруча і дрэнна дэлегаты Слуцкай акруговай партыйнай канферэнцыі абмеркоўвалі кандыдатуры ў склад акруткома, рэвізійнай камісіі, дэлегатаў на XVI з'езд КП(б)Б. Канферэнцыя рашыла абраць у склад членаў акруткома 35 таварышоў. Кандыдатур паступіла 67. У выніку абмеркавання ў спіс для тайнага галасавання пакінута 44, з якіх па большасці галасоў абрана 35. У склад кандыдатаў у члены пленума абрана 9 таварышоў.

24 мая канферэнцыя абрала 30 дэлегатаў з правам рашаючага голасу на XVI з'езд КП(б)Б. З правам дарадчага голасу на з'езд патрэбна было абраць 6 дэлегатаў, але пры галасаванні галасы разбіліся. У спіс для тайнага галасавання было пакінута 20 чалавек, з іх аказалася абранымі большасцю галасоў толькі 2 чалавекі. Каб забяспечыць поўны склад дэлегатаў на з'езд канферэнцыя рашыла правесці давыбары 4 дэлегатаў з правам дарадчага голасу. Далей канферэнцыя абрала рэвізійную камісію.

24 мая на вячэрнім пасяджэнні канферэнцыі з прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч.

Па гэтым-жа пасяджэнні абмеркавана і зацверджана рэзалюцыя па асобнаму дакладу акруткома. У рэзалюцыі адзначаны буйнейшыя недахопы ў рабоце акруговага і раённых камітэтаў партыі. Разам з гэтым вызначан рад практычных мерапрыемстваў, якія павінны забяспечыць перабудову работы ўсёй акруговай партыйнай арганізацыі ў адпаведнасці з рашэннямі Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б).

25 мая закрылася другая Слуцкая акруговая партыйная канферэнцыя.

***

Пасля закрыцця канферэнцыі адбыўся арганізацыйны пленум акруткома новага складу. Абрана бюро акруткома з 9 членаў. Першым сакратаром акруткома пленум абраў тав. Каменштэйна, другім сакратаром тав. Нікіціна.

І. ШЛЯФЕР.

## ГОМЕЛЬСКІ РАЁН

25 мая. Учора распачаў сваю работу раённы партыйны сход вясковай Гомельскай партыйнай арганізацыі.

На першым пасяджэнні сход выразнуў арганізацыйныя пытанні, а таксама заслухаў справаздачны даклад сакратара гаркома партыі т. Стакуна аб рабоце гомельскага гаркома партыі. Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі.

П. ЧЫКУН.

## НА АКТЫВЕ РАБОТНІКАЎ СУВЯЗІ

Учора вечарам у клубе сувязі адкрыўся ўсебеларускі сход актыва работнікаў сувязі. Упаўнаважаны Беларускага кіраўніцтва сувязі т. Паўлаў у сваім дакладзе перадчыў многа фактаў шкодніцтва на радзе важнейшых аб'ектаў, агідай работы пошты, тэлефона, тэлеграфа, засмечанасці апарата і інш.

Але далей гэтага дакладчык не пайшоў. Паўлаў ні слова не сказаў аб тым, што зрабіў ён як кіраўнік важнейшай галіны народнай гаспадаркі для перабудовы работы, палітычнага выхавання кадраў, для ліквідавання чыстак сувязі і выкуўлення ворагаў, засеўшых у апараце.

Пасля лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) прайшло ўжо каля трох месяцаў. Адмах у Беларускім кіраўніцтве сувязі нічога абсалютна не змянілася. Тут ніякіх урокаў не зрабілі са шкодніцтва япона-германа-трацкісцкіх агентаў і шпіёнаў, якія доўгі час арудавалі ў органах сувязі. Іх астаткі яшчэ жывучы і зараз. Пад рознымі маскамі ворагі стараюцца шкодзіць нам. Што-ж рабіў Паўлаў для таго, каб выканаць рашэнні Пленума і ўказанні таварыша Сталіна? Аб гэтым ён у першую чаргу павінен быў расказаць актыву.

Быў час, калі стаханоўскі рух моцна вырас у органах сувязі. Але пасля кароткага шуму ўсё заглохла. Тав. Паўлаў не мог назваць ні аднаго прозвішча стаханоўца. Яму бяспрэчна ёсць, і іх нямала. Але з гэтымі людзьмі не працуюць, іх заціраюць у нетрах бюракратычных канцылярый.

Сувязь з'яўляецца да апошняга часу самым адсталым участкам работы ў рэспубліцы. Дастаткова сказаць, што за адзін толькі першы квартал 1936 года паступіла ў Беларускае кіраўніцтва сувязі 4.967 скарг. У большасці сваёй яны адносяцца да работнікаў пошты.

Ёсць сотні выпадкаў засылкі пісем і грашовых пераводаў, залежванне іх месяцамі нават ў такіх гарадах як Менск і Гомель. У апаратах пошты яшчэ сядзяць бюракраты, чыноўнікі, якія адсяжваюцца над працоўнымі.

Выступіўшы з прамовай загадчык гомельскага аддзялення сувязі тав. Внук пайшоў на стапах дакладчыка. Ён таксама пералічыў факты дрэннай работы пошты, тэлеграфа і гэтым палічыў сваю місію вычарпанай.

Між іншым, т. Внук зусім «забыў» сказаць аб грубейшым запіскі крытыкі на гомельскай тэлефоннай станцыі, аб здзеках над лепшай стаханоўкай-тэлефаністкай Шурай Прыходзька. Відавочна, Внук не хоча па-большэвіцку выкрыць усю тую гнілую атмасферу, якая стварылася на гомельскай пошце.

Старшая тэлефаністка Загорская (Полацк) расказала як начальнік акрутовага аддзела сувязі Чэсных запіскае крытыку і пры першым зручным выпадку звальняе «незадаволеных».

Характэрна адзначыць, што ніхто тут, на актыве, выступаючыя, гаворачы аб недахопах, баяцца назваць прозвішча людзей, каб пасля не напасці ў немілась начальства.

І. Т.

## АДКРЫЛАСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ АРХІТЭКТАРАЎ

Учора ў клубе работнікаў асветы адкрылася канферэнцыя архітэктараў БССР.

На жаль, з самага пачатку адчуваецца неарганізаванасць у рабоце канферэнцыі. Яна пачалася са спазненнем на тры гадзіны. Дэлегатаў з рашаючым голасам павінна было быць 40, а з'явілася 25. Яўна недастатковае прыцягнута грамадскасць: прадстаўнікоў будаўнічых арганізацый і стахановаў прысутнічала ўсяго 66 чалавек.

Учора са справаздачай аб рабоце праўлення саюза совецкіх архітэктараў БССР выступіў старшыня праўлення тав. Амбражунас. Яго даклад не мог задаволіць удзельнікаў канферэнцыі. Тав. Амбражунас добрых тры чвэрткі свайго даклада прасвяціў разважанням наогул аж да пераходу да пытанняў аб міжнародным становішчы. У дакладзе мімаходам гаварылася аб шкодніцтве ў архітэктуры, якое мелася ў БССР. Таксама мімаходам упаміналася і аб канкрэтных ворагах, як напрыклад, аб выкрытым трацкісце, нейкім Стотландзе, які падвізаўся на архітэктуры. Мала сапраўдная большэвіцкай самакрытыкі было ў дакладзе і па поваду работы праўлення.

Н. ГАРНЫ.



Начальнік зімоўкі на Паўночным полюсе І. Д. Папанін (злева) і пілот самалёта «СССР Н-172» тав. Казлоў на аэрадроме ў Халмагорах ля ўпакаванага снаражэння для зімоўкі.
Фото К. Каробіцына (СФ).

М. ВАДАП'ЯНАЎ
Герой Совецкага Саюза

# НАШ ПАЛЕТ НА ПОЛЮС

У сярэдзіне мінулага года Кіраўніцтва «Главсевморпути» атрымала заданне Урада арганізаваць высокашыротную экспедыцыю. Гутарка ішла не аб пастаянным новага сусветнага рэкорда. Гутарка ішла аб больш сур'ёзнай справе—аб асваенні Паўночнага полюса.

Было прапанавана падрыхтаваць для гэтай мэты чатыры цяжкіх самалёты. Яны павінны былі ўзяць на борт групу навуковых работнікаў і высадзіць іх на геаграфічным пункце Паўночнага полюса. Яны-ж павінны былі забяспечыць першых зімоўшчыкаў полюса дастатковай колькасцю навуковых прылад, гаручага і харчоў. Тэрмін зімоўкі на полюсе быў вызначан гадовы. Пасля гэтага тэрміна самалёты экспедыцыі павінны знянь зімоўшчыкаў з полюса і даставіць іх назад у Маскву.

На падрыхтоўку да экспедыцыі нам аставалася надзвычайна мала часу. Ён вылічваўся месяцамі. У гісторыі палярных даследванняў — гэта небывала кароткі тэрмін. Класічныя палярнікі — амерыканцы, канадцы і нарвежцы рыхтавалі экспедыцыі ў высокія шыроты па некалькі гадоў. Адзіны чалавек, пабываўшы ў непасрэднай блізасці ад полюса, амерыканскі палярны даследчык Роберт Пірэ рыхтаваўся да сваёй экспедыцыі 23 гады.

Совецкая тэхніка знаходзіцца на ўзроўні сусветнай тэхнікі, а ў іншых галінах, скажам, у авіяцыйнай, ужо сур'ёзна апярэджвае яе. Наша радзіма мае магутную і першакласную прамысловасць. Усё гэта разам узятае, дазволіла нам укласціся ў надзвычайна кароткія тэрміны і добра падрыхтавацца да найцяжэйшай экспедыцыі.

Харчовая прамысловасць нашай радзімы зрабіла значныя поспехі. Яны дапамаглі нам падабраць іменна такія прадукты харчавання, якія неабходны ў Арктыцы.

У адрозненне ад усіх мінулых арктычных экспедыцый, мы амаль не бярэм з сабой цяжкіх вадкіх кансерваў. Мы замянілі іх сухімі і лёгкімі харчовымі канцэнтратамі (бульённыя кубікі, сухое малако, шакалад і т. д.). Дзякуючы гэтаму трохмесячны недатыкальны запас харчавання для ўсяго экіпажа, які знаходзіцца на кожным караблі, важыць менш стандартнага паўтарамесячнага.

Многа часу і працы адабрала пашыўка палярнага абмундзіравання. Увесь лётна-пад'ёмны склад экспедыцыі апранут у самы цёплы тып палярнага абутку — у ненецкія пімы з неблюя (мех маладога аленя) і футровыя панчохі. Усе атрымалі скураныя шаўровыя штаны і замшавыя курткі. Усе маюць футровыя штаны, футровыя рубахі і скураныя і футровыя паліто. Усе лётчыкі экспедыцыі апрануты ў мяхлушкавыя шубы на лісім футру.

***

З Масквы экспедыцыя паляцела на полюс па такому маршруту: Нар'ян-Мар, Амдэрма, востраў Рудольфа (на Зямлі Франца Іосіфа)—Паўночны полюс. Трасса загадзя падрыхтавана. У Нар'ян-Мары, на Мысе Жаланія і на востраве Рудольфа ўстаноўлены радыёмаякі.

На востраве Рудольфа загадзя, яшчэ восенню мінулага года, абсталявана база да надыходзячай экспедыцыі. Там пабудавана палярная станцыя, сістэматычна вядучая метэаралагічныя наглядання, жылыя дамы і аэрадром.

Ніхто не быў на Паўночным полюсе і ніхто не можа ўпэўна сказаць, што ён з сябе прадстаўляе. Палярныя даследчыкі, пабываўшыя ў высокіх шыротах Арктыкі і нават пралятаўшыя над полюсам на дырыжаблях і самалётах, сцвярджаюць, што ўвесь раён Паўночнага полюса пакрыт магутным пакавым ільдом. Гэта дае магчымасць меркаваць, што на полюсе знойдуцца даволі роўныя пляцоўкі для пасадкі нашых цяжкіх караблёў.

М. Т. СЛЕПНЁЎ
Герой Совецкага Саюза

# ВЯЛІКІ ПЕРАЛЕТ

Якасное першынства ў асваенні Арктыкі належыць Совецкаму Саюзу. Старыя даследчыкі, якія працавалі ў Арктычным басейне, у тым ліку і рускія, арганізоўвалі масу экспедыцый, разведаўшых, вядома, некаторыя раёны Паўночнага Палярнага мора, але наколькі работы гэтых экспедыцый не былі аб'яднаны агульнай мэтай, эфектыўны рэзультат іх быў вельмі малы. Да найбольш буйных дарэвалюцыйных работ трэба аднесці паход Нарденшэльда, прайшоўшага першым на судне «Вега» Палярнае мора ад Скандынавіі да Чукоткі. Цікавы паход зрабіў Нансен, дрэйфаваўшы ў палярным ільду на судне «Фрам». Дванцацітрохгадовыя спробы амерыканца Пірэ ўвянчаліся поспехам у 1909 годзе, калі яму, нарэшце, удалося дасягнуць Паўночнага полюса: ён зрабіў пераход на сабаках з Грэнландыі. Амундсен з Нобіле на дырыжаблі «Нарвегія» зрабілі пералёт з Ньеапаля праз Ленінград, Шпіцберген і Полюс у Аляску, зрабіўшы пасадку на замёрзшым возеры паблізу вёскі Тэлор у ЗША. Вількіцкі на караблях «Таймыр» і «Вайгач» у 1912 годзе знайшоў Паўночную зямлю, апісаную ў совецкі час Г. А. Ушаковым.

Усе гэтыя цікавыя экспедыцыі былі разрозненымі, рабіліся прадстаўнікамі розных дзяржаў і могуць лічыцца толькі як садзейнічаўшыя канчатковаму заваяванню Арктыкі.

Але вось на сусветную арэну выйшлі прадстаўнікі новай краіны, пабудаваўшай сацыялізм на адной шостай сушы зямнога шара, і справа асваення поўначы стала адразу ў іншую плоскасць.

На змену старым спосабам даследвання пры дапамозе сабак, вельботаў, малатанажных караблей совецкая ўлада паставіла магутную тэхніку СССР, кіруючь якой валявыя, ведаючыя сваю справу людзі-энтузіясты асваення Арктыкі. На змяне з'явіліся магутныя ледаколы, усюдыходы, радыёстанцыі і самалёты. Даследванне поўначы стала праводзіцца па строгаму плану, ахапляючы ўсё больш далёкія пункты.

Да пачатку гэтага года былі пабудаваны і меліся зімоўкі, аснашчаныя навейшай тэхнікай ва ўсіх пунктах Арктыкі, дзе ёсць суша. Найбольш далёкімі, глыбока пранікаючымі сваім уздзеяннем зімоўкамі з'яўляюцца зімоўкі на востраве Рудольфа архіпелага Зямлі Франца Іосіфа зімоўка на мысе Жаланія (Новая Зямля), зімоўка на астравах С. С. Каменева архіпелага Паўночнай зямлі, совецкая калонія на востраве Врангеля.

Вопыт двухмесячнага прабывання на дрэйфуючых ільдах лагера чэлюскінцаў, не спыняўшых навуковай работы, і выратаванне людзей самалётамі, зрабіўшымі масу пасадак на ільдзінах, далі магчымасць мысліць аб арганізацыі лагера, створанага ўжо не дзякуючы выпадковасці, а знарок, і стварыць план арганізацыі дрэйфуючай на ільду палярнай станцыі. Месцам для такой станцыі быў выбран Паўночны полюс.

План звёўся да наступных элементаў. На самым паўночным востраве архіпелага Зямлі Франца Іосіфа — на востраве Рудольфа — арганізоўваецца палярная станцыя, якая аснашчана радыё і метэастанцыяй, з жылымі дамамі і падсобнымі памяшканнямі, з патрэбнай колькасцю авіяцыйных і навуковых работнікаў. Усё абсталяванне станцыі завезена ў летні час караблямі ледакольнага тыпу. У Маскве была падрыхтавана група самалётаў, якія могуць узяць на борт вялікую колькасць снаражэння і абсталявання для дрэйфуючай станцыі Паўночнага полюса. У Маскве была арганізавана навуковая група гэтай станцыі ў складзе чатырох чалавек: начальнік зімоўкі, радыёст, астраном, гідролаг.

Самалёты ў вясенні час, калі ў раёне полюса — круглыя суткі сонца, але калі яшчэ не пачынаецца таянне, пералятелі на востраў Рудольфа, зрабілі развалку надвор'я ў паўночным напрамку, вылецелі на полюс, высадзілі там дэсант дрэйфуючай станцыі.

Склад дрэйфуючай палярнай станцыі павінен правесці гадовую работу ў раёне полюса, і ў залежнасці ад месца, дзе ён акажацца праз год, будзе знят самалётамі, дырыжаблем або магутным ледаколам.

Для выканання гэтых работ, агульнае кіраўніцтва якімі ўскладзена на акадэміка Отто Юльевіча Шмідта, урадам СССР быў запверджан наступны склад дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс»: начальнік зімоўкі тав. І. Д. Папанін, радыёст Э. Т. Кренкель, гідролаг П. П. Ширшоў і астраном-магнітолаг Е. К. Фёдараў. Была арганізавана лётная група, якая складаецца з чатырох маторных самалётаў металічнай канструкцыі і аднаго двухматорнага.

Склад экіпажаў назначан быў наступны:

Самалёт «СССР Н-170»—пілоты Герой Совецкага Саюза т. Вадап'янаў і заслужаны лётчык Рэспублікі т. Бабушкін. На гэтым самалёце знаходзіцца О. Ю. Шміхт, флаг-штурман авіягрупы т. Спірын і начавіяслужбы ГУСМП т. Шэвелеў.

Самалёт № 171 — пілот Герой Совецкага Саюза т. Молакаў і пілот т. Орлоў.

Самалёт № 172—пілоты тт. Алексеў і Казлоў.

Самалёт № 169 — пілоты тт. Мазурук і Машкоўскі.

Самалёт № 166 — пілот т. Галовін і бортмеханік т. Кекушаў.

Агульны склад экспедыцыі каля 45 чалавек.

Самалёты вылецелі з Масквы ў 12 гадзін 35 мін. 22 сакавіка, будучы на калёсах, і ўдала прыбылі ў Халмагоры пад Архангельскам, маючы сярэднюю хуткасць у дарозе, роўную 217 кілометраў у гадзіну. Тут уся група затрымалася на некалькі дзён з-за надвор'я і з прычыны неабходнасці перастаноўкі самалётаў з калёс на лыжы. Аперацыя па перастаноўцы, з прычыны большагрузнасці самалётаў, была, натуральна, цяжкай: самалёты маюць палётную вагу, дасягаючую 22 тон. Наступным этапам з'явіўся пералёт Халмагоры — Нар'ян-Мар, правезены ўдала з хуткасцю 240 клм. у гадзіну.

А потым пералёт Нар'ян - Мар — востраў Рудольфа. Тут лётная экспедыцыя грунтоўна падрыхтавалася да апошняга этапа прыжка на полюс і 21 мая вечарам радыёстанцыя Паўночнага полюса паведаміла ўсёй краіне радасную тэлеграму для даклада партыі і ўраду СССР аб тым, што першая задача — высадка на полюс зроблена ўдала.

У бліжэйшыя дні астатнія самалёты экспедыцыі завязуць на полюс абсталяванне палярнай станцыі і ўвесь свет будзе сведкаю, як храбрая чапвёрка ў складзе Папанина, Крэнкеля, Шыршова і Фёдарава прыступіць да «абжыцця» Паўночнага полюса.

# НАСЦЕНГАЗЕТА, СХАВАНАЯ АД ЧЫТАЧОЎ

Не любяць крытыкі ў трэсце «Менбуд». Тут яшчэ ніяк не хочуць зразумець, што крытыка і самакрытыка, як паветра неабходна нам для пасяховага прасоўвання наперад, для пасяховай барацьбы з ворагамі партыі і народу.

Рэдкалегія вучнёўскай брыгады маляра-нага цэха «Менбуда» да першамайскага свята выпусціла насценгазету. У ёй быў змешчан артыкул «Дзе наша начальства».

У гэтым артыкуле гаворыцца, што сакратар парткома «Менбуда» т. Данкман і дырэктар трэста т. Голубаў не любяць крытыкі, не прыслухоўваюцца да голасу мас. За пяць месяцаў існавання вучнёўскай брыгады ніхто з іх нават не зайшоў да маладых рабочых, не пагутарыў з імі, не пацікавіўся, як яны жывуць і працуюць...

А зацікавіцца было чым. Арганізаваная вучнёўская брыгада была здана на водкуп інструктару брыгады кандыдату ў члены партыі т. Лунгіну. Усё навучанне гэты інструктар звёў да таго, што заводзіў вучняў на новабудоўлі і казаў: «Працуйце!». Ніжай, нават самай элементарнай, тэарэтычнай падрыхтоўкі ім не даецца. Высококваліфікаваныя рабочыя з іх не рыхтуюцца.

Культурна-масавай работы сярод маладых рабочых абсалютна ніжай не праводзіцца. Культработнік ні аднаго разу не зайшоў у брыгаду. Сакратара комсамольскага камітэта нават і не ведаюць маладыя рабочыя. А яму трэба было зацікавіцца, як жыве моладзь трэста.

Аб усім гэтым пісала насценгазета. Маладыя рабочыя па праву патрабавалі да сябе ўвагі. Яны крытыкавалі сакратара парткома т. Данкмана, дырэктара трэста т. Голубава і культработніка.

Як толькі газета была падрыхтавана выхаду, паслужлівы інструктар брыгады Лунгін пашёс яе сакратару парткома Данкману на...«цэнзуру». Апошняму, відаць, не вельмі спадабаўся такі тон газеты і ён сказаў прыйсці за газетай пазней... Газета так і не ўбачыла свету.

Сакратар парткома т. Данкман тлумачыць цяпер так: «Бачыце, у газеце былі палітычныя памылкі, афармлена яна вельмі прыгожа і наогул мы хацелі падправіць..., таму крыху і затрымалі».

Цікава, што партком «Менбуда», добра ведаючы аб гэтым факце заціску самакрытыкі з боку сакратара парткома т. Данкмана, палічыў яго звычайнай з'явай.

Справа з крытыкай і самакрытыкай у трэсце абстаіць зусім дрэнна. Прыклады у гэтых адносінах можа служыць і насценгазета, выпушчаная да першамайскага свята ў канторы трэста. У ёй толькі артыкулы гаворыць аб дробных недахопах другарадных работнікаў трэста. І поруч тымі бяззубымі артыкуламі аўтары паабіліся падпісаць сваё прозвішча і схавались за псеўдонімы. У газеце асталося незапоненае месца, а матэрыял, у якім пісалі аб недахопах у рабоце трэста, астался нескарыстаным. Гэта вельмі яркі паказальнік, як паважаюць крытыку і як самакрытыкуюць у трэсце «Менбуд».

Даклад і заключнае слова таварыша Сталіна на апошнім Пленуме ЦК ВКП(б) і рашэнні Пленума вучаць нас паважаць крытыку і самакрытыку, прыслухоўвацца да голасу «маленькіх» людзей. Аднак гэтыя важнейшыя дакументы нашага часу яшчэ нічому не навучылі сакратара парткома трэста «Менбуд» т. Данкмана.

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ.

## ЭКЗАМЕНАМ ПАГРАЖАЕ ЗРЫЎ

Да канца навучальнага года астаюцца лічаныя дні. У якіх-жа ўмовах знаходзімся мы ў гэты час? У нас на другім курсе фінансавага факультэта інстытута народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышева зусім несприяючыя ўмовы для патрэбнай падрыхтоўкі к экзаменам. Здаваць нам трэба 7 прадметаў. Справа даволі складаная, але нашы абставіны штурхаюць нас на тое, што большасць студэнтаў экзамены праваляць.

Чаму? Таму, што трэба рыхтавацца да здачы прадметаў, а большасць іх яшчэ не закончана. Заняткі ў нас будуць да 15 чэрвеня, а за астаўшыяся 15 дзён трэба будзе здаць усе прадметы. Распачата здача экзамена па эканомгеаграфіі. Здаюць. Але ёсць і такія (іх многа), якія яшчэ не здавалі і геаграфіі. Замест таго, каб разгрузіць студэнтаў, выкладчыкі ідуць на такія «ўступкі»: прадмет па плану павінен быць закончан 15 чэрвеня, дык яны астаўляюць студэнтаў на 2 гадзіны пасля лекцый і «падганяюць» сваю дысцыпліну.

Так у нас абстаіць справа з нямецкай мовай, якая замест 4 гадзін у тыдзень (па раскладу) бывае шесць гадзін.

Па ваеннай падрыхтоўцы халтурыць, а мест таго каб займацца з кожнай групай. Выкладчык Равенка на свайму асабістаму жаданню адразу чытае лекцыі для трох груп. Гэты метад спадабаўся многім выкладчыкам і ёсць магчымасць, што ён дзе ўжыт і па статыстыцы.

Калі студэнт па якой-небудзь справе хоча зайсці да дырэктара, дык на гэта ён ба затраціць шмат часу, а шмасці ўсе цяжка.

Усё гэта паказвае, што экзамены могуць быць сарваны.

Група студэнтаў: А. ПАСЮК, П. ШЫ-КА, Н. МАЗОЎКА, Ф. КУЛЕЦ, Т. СТР Н. ФАМІНОВА.

Ад рэдакцыі. Пісьмо студэнтаў — с часовае папярэджанне магчымага зр экзаменаў. Відавочна, што дырэкцыя інс тута і Дзяржплан БССР, якому падпа каваны інстытут, не стварылі належ умоў для работы студэнтаў. Мы ча неадкладнага адказу аб прынятых мера сутнасці ўнятых пытанняў у друкуе пісьме.

## Горсовет не паважае сваіх выбаршчыкаў

На працягу года тав. Русальскі амаль кожны дзень ходзіць у менскі горсовет, горжылкіраўніцтва з просьбай даць яму кватэру, але ён гэтага ніяк не можа дабіцца.

Хто такі Русальскі? Ён—інвалід. Тым не менш па вытворчасці з'яўляецца стаханоўцам. Жыў у падвальнай кватэры, якую заліло вадой. Здавалася-б, што ў такіх выпадках, калі мець на ўвазе чулыя адносіны да жывога чалавека, трэба было зараз-жа дапамагчы яму. Але ў горсовеце прызвычаіліся здзекавацца над сваімі выбаршчыкамі.

Аднаго разу т. Русальскаму ўдалося набыць на прыёме ў т. Жуковіча, які яму паабяцаў урэгуляваць гэта пытанне праз загадчыка комгаса Гальперына.

Што-ж робіць Гальперын?

З тым, каб адчапіцца ад т. Русальскага, ён прадаставіў яму кватэру... далёка ад горадам. Гэта махінацыя была зроблена свядома, бо Русальскі—інвалід і не можа жыць у ёй. Ён вымушан быў пакінуць вытворчасць, а таксама не займацца на курсах стаханоўцаў, куды ён залічан. Гальперыну да гэтага мала да. Ён зараз нават і не хоча гаварыць, сцвярджаючы адно: «я, моў, даў кватэру Русальскі адмовіўся».

Гэта сведчыць, што горсовет не паважае сваіх выбаршчыкаў, ён не клапоціцца аб іх. Не зрабіў яшчэ горсовет для сябе і вывадаў з той крытыкі, якой падвергнута яго работа ў апошні час.

Г.

## БЕЗАДКАЗНЫЯ АДНОСІНЫ

Да тэрміновай пабудовы і абсталявання Ветрынскага радыёвузла радыёаддзел Упаўнаважанага наркамата сувязі СССР па БССР аднёсся зусім безадказна. Пад радыёвузел адведзена сялянская лазня, у якой устаноўлена старая радыёапаратура моцнасцю да трох ват — на 100 радыёкропак і на 7 гадзін работы ў суткі. Атрымалася нейкая недарэчнасць, а не радыёвузел.

Адсутнічае памяшканне для майстэрні па рамонту радыёўстановак у раёне. Няма памяшкання для рэдакцыі нізавога вяшчання, для канцылярыі, для кватэры ботнікаў. Ужо некалькі месяцаў як загадчыка радыёвузла. Работнікі пад ны з мясцовых радыёаматараў, які былі на курсах і ім працаваць цяжка ста бываюць скажэнні і зрывы пер прастої і т. д.

Усё гэта вядома радыёаддзелу Упаважанага наркамсувязі, але там мер не прымаюць і безадказна адносяц патрэб радыёвузла.

П. ГЕРАСІМЕНК

## Спакой, які на-руку ворагам

Да гэтага часу на палічах кармянскай раённай бібліятэкі знаходзяць сабе прытулак «творы» контррэволюцыйных нацдэмаў, ворагаў беларускага народу Зарэцкага і інш. Чытачы бачаць, напрыклад, такі контррэволюцыйны твор, як «Вязьмо» Зарэцкага. На гэта мы давалі заўвагу работнікам бібліятэкі. Яны адказваюць: «Аб тым, што гэта варожая літаратура, няма ніякіх указанняў».

Дакуль будуць чакаць гэтых, з лу сказаць, указанняў, Галоўліта?

***

АД РЭДАКЦЫІ. «Звязда» яшчэ 28 красавіка пісала аб здзіўляючай бяспечнасці Галоўліта БССР, які не даў указання аб знятні з карыстання «твораў» ворагаў народу Гартнага, Зарэцкага і інш. у школах Веткаўскага і Усаравіцкага раёнаў. Пісьмо з Кармы, якое мы сёння друкуем, паказвае, кіраўнікі Галоўліта не зрабілі для ніякіх выводаў і мер не прынялі.

Мы патрабуем тэрміновага адказу аб прынятых мерах па сутнасці ўнятага пытання ў друкуемым пісьме.

## ПАЖАРНЫЯ МАШЫНЫ СКАРЫСТОЎВАЕ МАШЫНАТРАКТАРНАЯ СТАНЦЫЯ

У мястэчку Добрамысль, Лёзнянскага раёна, ёсць пажарнае дэпо, але пажарны інструмент, як рыллёўкі, сякеры, вёдры і багры — раскралі. Старшыня сельсовета распараджаўся пажарныя бочкі звезці ў рэчку для замочкі. Бочкі ў вадзе праляжалі з восені 1936 года да гэтай вясны. Калёсы пакралі, а бочкі вадою ўнесены.

Асталіся ў дэпо пажарныя машыны, але іх Добрамыслянская машынатрактарная станцыя скарыстала для мыцця аўтамашын. Руказы ад машын згніілі.

Ф. ПЕТРАВІЦКІ.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯ «ЗВЯЗДЫ»

## „ЖУЛІКІ НА МАЗЫРСКІМ МЯСАКАМБІНАЦЕ"

Пад гэтым загалоўкам у «Звязде» 21 сакавіка была змешчана карэспандэнцыя аб злоўжываннях на мазырскім камбінаце.

Мазырскі райком КП(б)Б паведаміў, што ўказаныя факты ў карэспандэнцыі праверены і поўнасцю пацвердзіліся. Пленум бюро райкома ад 4 мая за... ны віноўнік — былы загадчык базы бінатта Фішман—выключан з радоў партыі. Прокуратура раёна па гэтай справе заведзена следства.

# ГАСТРОЛЕИ ЦЭНТРАЛЬНАГА ТЭАТРА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ У МЕНСКУ

**...тарна з мастацкім кіраўніком тэатра ...служаным дзеячом мастацтваў А. Д. Паповым**

...нтральны Тэатр Чырвонай Арміі быў ...ізован восенню 1929 года. Перад ім ... пастаўлена задача паказаць у ма...іх вобразах людзей Чырвонай Арміі, ...яную абаронную работу, іх рост і ...адносіны. Але ў нашай бацькаў...е ўсе гэтыя тэмы не могуць быць ...кі» і абмежаванымі. Людзі нашай ... іх інтарэсы самым цесным чынам ... з інтарэсамі ўсёй краіны. Таму ре...ар Тэатра Чырвонай Арміі не заны...а толькі ў ваенную тэматыку. Лю...учасная п'еса, якая пераканаўча ад...оўвае нашу совецкую рэчаіснасць, ... быць уключана ў рэпертуар тэатра. ...і наша армія выхоўвае не толькі ..., але і культурнага, усебакова разві...чалавека, дык і Тэатр Чырвонай Ар...атуральна, пашырае рамкі свайго ра...ора для паказу са сцэны твораў су...ай класічнай драматургіі.

...нтральны Тэатр Чырвонай Арміі за ...од свайго існавання рос і развіваўся ...намерна. У яго быў і свой перыяд ...ства, паражэння і перамогі. Пачаў...палітычна актуальных, але мастац...калькі схематычных п'ес, тэатр ...ова перайшоў да больш глыбокага ... вобразаў нашай гераічнай сапраўд...Рад апошніх работ тэатра дазва...гаварыць аб Тэатры Чырвонай Ар...ж аб аформленым творча тэатраль...арганізме, маючым свой твар, пасля...выражаны ў радзе спектакляў.

...ектыў тэатра нясцомна працуе над ...нем адзінага творчага метаду, кла... ў аснову крытычнае асваенне ба...рускага тэатра. Тэатр вырастаў не ...ы, а шляхам паслядоўнага адбору ...оў совецкага тэатра, як сталіцы, ... перыферыі, а таксама шляхам вы...ня і вырошчвання таленавітага со...а акторскага маладняка. Зараз у ...е калектыва тэатра маем цэлы рад ...оў, якія заслужана карыстаюцца ... і прызнаннем гледача сталіцы і ...ерыі.

...то знаходзіцца напярэдадні пераходу ...лейшае тэатральнае памяшканне ста...лае будуцца для яго. Пры праекта...будаўніцтва ўлічаны навейшыя да...ні тэатральнай тэхнікі.

...то праводзіць вялікую работу на ...нню новага рэпертуара. Нам удало...знавіць цесныя і дружныя ўзаема...ны з працуючымі ў нашым тэатры ...ургамі. Цэлы рад п'ес, атрымаўшых ...касаюзную вядомасць, заряджаліся ў ... тэатры. У цесным дружным кан... з драматургамі мы бачым лепшы ... у зжыцці, так званага «крызіса» ра...ора. Мы можам з гордасцю заявіць, ... адрозненне ад цэлага раду іншых ..., нам не знаёма пачуццё рэпертуа...голаду. Нам удалося на працягу 1936—37 г. выпусціць пяць работ ...рна падрыхтаваць вялікую работу ...экспірам. У пачатку надыходзячага ... мы пакажам «Укрощение стропти...

...ісе нашых гастролей у Менску бу...казаны наступныя спектакалі тэат...І вас люблю» І. Прута ў пастаноўцы ...В. Я. Тінот, мастакі А. Д. Ганча...І. П. Папоў; «Мешчане» М. Горкага ...ноўцы заслужанай артысткі рэс...І. Е. С. Тэлешовай, мастак І. С. Фе...; «Слава» В. Гусева ў пастаноўцы ...Глекава і В. П. Пільдона, мастак ...Шыфрын; «Год 19» І. Прута ў па...ноўцы заслужанага дзеяча мастацтваў ...Папова, мастак І. С. Федотаў; «Васа ...ова» М. Горкага ў пастаноўцы за...ай артысткі рэспублікі К. С. Тэле...мастак В. П. Кісялёў.

...памятны цёплы прыём, аказаны ...ліцкай брацкай рэспубліцы ў ранней...ні прыезд. З радасцю чакаем нашай ... творчай сустрэчы.

21 мая самалёт «СССР Н-170», пілатуемы Героем Совецкага Саюза М. В. Вадап'янавым, зрабіў пасадку на лёд у раёне Паўночнага полюса. Над Паўночным полюсам развяваецца сцяг Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. НА ЗДЫМКУ: на чальнік паўночнай экспедыцыі О. Ю. Шмідт гутарыць з жонкай і сынамі на Маскоўскім аэрадроме перад адлётам.

Фото Б. Фішмана (СФ).

# НЕЦЯРПІМАЕ АДСТАВАННЕ АСІНТОРФА

Асінторф — буйнейшы механізаваны торфяны завод у БССР — асноўная паліўная база Белдрэса. Ад таго, як ён забяспечыць высокаякасным паливам БелДРЭС залежыць выкананне плана прамысловасці Віцебска, Оршы, Магілева. У гэтым годзе ён павінен здабыць 349 тысяч тон торфу — амаль у два разы больш, чым у мінулым годзе.

Але ўжо з першых дзён работы завод не выконвае плана. З кожным днём павялічваецца запазычанасць па здабычы торфу. На 10 мая яна склала 20.794 тоны. Красавіцкі план па гідраторфу заводам выкананы на 84 проц., па машына-фармовачнаму торфу — на 38,7 проц. Не лепшыя паказальнікі даў завод за 10 дзён мая. План па гідраторфу выкананы на 69 проц., па машына-фармовачнаму на 64 проц.

Чаму завод, які забяспечан поўнасцю машынамі, не выконвае свой план? Прычына ў тым, што тут за агульнымі размовамі аб механізацыі торфаздабычы хаваецца ляўнае нежаданне максімальна нагрузіць машыны, рацыянальна выкарыстаць механізмы. Аб гэтым красамоўна сведчаць паказальнікі работы торфаздабываючых машын. З 25 красавіка па 1 мая краны гідраторфу прапрацавалі 327 машына-гадзін, а прастаялі з-за няспраўнасці і па раду іншых прычын — 345 машына-гадзін. За 13 дзён красавіка элеватарныя машыны прастаялі 447 машына-гадзін.

Механізмы адрамантаваны выключна дрэнна. Мы спыніліся ля элеватарнай машыны № 16. Тут працуе брыгада тав. Жэрабава. Пры нас матарыст пусціў машыну. Вострыя лапаты кар'ерчыкаў урэзаліся ў торфяны пласт. Папрацавала яна не больш 5 мінут і стала. Аказваецца парваліся ланцугі Галя. Пачынаецца рамонт, а ў гэты час брыгада не працуе. Урэшце рамонт закончан. Машына пушчана ў ход, але праз гадзіну яна зноў па той-жа прычыне вымушана стаць. Праз кароткі час выяўляецца яшчэ адзін дэфект — не ўключаецца транспарцёр. І так увесь дзень — прастой за прастоем. Тав. Жэрабаў абуран. Яго брыгада з-за гэтага з'яўляецца адной з самых адсталых. Яна выконвае дзённае заданне на 30 проц.

Не лепш і на гідраторфе, які па сутнасці рашае выкананне агульнага плана. Няма таго дня, каб ён выканаў сваё заданне. Няма таго дня, каб ён не прастойваў. І тут прычына прастою ў дрэннай рабоце механізмаў, у нераспарадчасці, і няўменні арганізаваць работу на полі розліва (начальнік Фралоўскі). На перасоўку кранаў на полі здабычы (начальнік Ждан) траціцца па 4—6 гадзін замест 30 мінут. У канцы красавіка па віне тэхніка Бранцэўскага і матарыста Мефодзінкі кран № 1 быў скінут з рэйкаў і прастаяў два дні. Нядаўна кран № 4 таксама прастаяў 2 дні, у якім па віне матарыста Семчанкі былі расплаўлены падшыпнікі.

Многа прастойваюць краны з-за нядобраякаснага рамонту механізмаў, які мяжуецца з прамым шкодніцтвам. У часе выканання мантажных работ у водаправоды кранаў рукамі ворагаў былі наўмысна пакіданы металічныя часткі (балты, гайкі, клейсмейстары і інш.). З-за гэтага выведзены са строю нерухомыя элементы пожарасціраценяў. Электраматоры пушчаны ў эксплаатацыю нават нявысушанымі. У выніку ўжо зараз вышла са строю два такіх маторы.

Усімі рамонтнымі работамі на заводзе «кіраваў» галоўны механік механічных майстэрняў Новікаў. Пад яго кіраўніцтвам торфасос крана № 4 устаноўлен на кране № 3, а матор да торфасосу з крана № 1. На заводзе Новікава ведаюць як дезарганізатара і зрыўшчыка ўсіх работ па падрыхтоўцы машын да сезону, але ніхто ніякіх мер не прымае. Дырэктар завода Шульгоўскі, галоўны інжынер Власаў паперакор рэчаіснасці цэняць яго як незамянімага спецыяліста.

Адной з асноўных прычын адставання завода з'яўляецца ігнараванне і сабатаж стаханаўскага руху. На заводзе працуе каля 3.000 рабочых, але ніхто не можа назваць прозвішча лепшых стаханаўцаў. Знатныя людзі тут забыты. Да голасу мас ніхто не прыслухоўваецца.

У мінулым годзе брыгада тав. Козіка славілася на ўвесь Асінторф высокай прадукцыйнасцю працы. На 18 дзён раней тэрміна яна выканала сваё сезоннае заданне. Зараз гэту брыгаду паставілі ў такія ўмовы працы, што ні адзін дзень яна яшчэ не выканала свайго задання.

Па ўсяму Асінторфу таксама перадавалі вопыт лепшага стаханаўца-канаўшчыка Сімчанкі Захара, брыгада якога штодзённа давала не менш 160—200 проц. нормы. Сам ён у асобныя дні даваў рэкорды на 400—450 проц. задання. У сёлетні сезон тав. Сімчанка вылучан дзесятнікам на поле розліву, але яму не стварылі ўмоў для высокапрадукцыйнай працы — броўкі зроблены нядобраякасна, поле розліву нявыраўнена і інш. Неаднаразова тав. Сімчанка звяртаўся да кіраўнікоў завода за дапамогай, але дарэмна: ніхто не знаходзіў часу, каб нават выслухаць яго. Нарэшце ён вымушан быў падаць заяву аб звальненні. Яго просьбу задаволілі. Так казённа, бяздушна аднесліся на заводзе да свайго лепшага стаханаўца.

Такія ўмовы створаны і для іншых стаханаўцаў. Многія стаханаўцы цэнтральнай механічнай майстэрні (Пракопкін, Станкевіч, Глазуноў і інш.) зусім выйшлі з завода. Або такі факт. У мінулым годзе лепшы стаханавец — майстар тав. Трублін адпачываў на курорце. У добрым настроі вярнуўся ён на завод не падазраючы, што яго чакае непрыемнасць. Галоўны механік Новікаў на яго месца знайшоў «свайго» чалавека — Куткоўскага, а Трублін да работы не быў дапушчаны.

Рабочым не створаны ўмовы і для адпачынку. У інтэрнаце № 2 (другі пасёлак) 16 чал. не забяспечаны пасцельнымі прыладамі, спяць яны на брудных, голых матрацах. Там-жа, дзе ёсць посцілкі, яны не мяняюцца па 15—20 дзён.

Белдзяржторфтрэст, Наркамляспром БССР і аршанскія совецкія, партыйныя арганізацыі спакойна наглядаюць гэтыя агідныя факты. Часта адказныя работнікі гэтых арганізацый прыязджаюць на завод, але карысці ад гэтага мала. Гэтымі днямі завод наведалі намеснік наркома мясцовай прамысловасці Галуза і галоўны інжынер трэста Сцяпанаў. Два дні яны пахадзілі па заводу, правялі нараду... і паехалі. Ці змянілася становішча завода? Не. Па-ранейшаму вяла працякае праца. Асінторф адстаў і зараз.

АСТРОЎСКІ.

# У ПАЛОНЕ БЮРАКРАТЫЧНЫХ ПАПЕРАК

Тав. Швернік у сваім дакладзе на VI пленуме ВЦСПС прывёў шмат фактаў і прыкладаў канцылярска-бюракратычных метадаў работы профсаюзных органаў і іх кіраўнікоў.

Няма сумнення, што работнікі рэспубліканскіх ЦК саюзаў чыталі аб гэтым. Але, на вялікі жаль, многія з іх да гэтага часу не ўяснілі таго палітычнага павароту, які павінен адбыцца ў жыцці профсаюзаў у сувязі з рашэннямі пленума.

Як можна расцаніць такія з'явы, калі ў буйнейшых цэнтральных праўленнях саюзаў лесапілення, дзяржтандлю, цагельнікаў, хлебапячэння да гэтага часу яшчэ нічога не зрабілі, каб давесці да сваіх членаў саюза рашэнні пленума.

У ЦК саюза лесапілення ды засталі адзіную сакратара-мапыністку, яна-ж кіраўнік спраў т. Палеес. Яна нявінна разводзіць рукамі, што нічога яшчэ не зрабілі, нават указанняў на месцы не далі.

Старшыня ЦК Хейфец паехаў 24 мая ў Маскву на пленум ЦК саюза і ад яго чакаюць «тэлеграмы з дырэктывамі». Да гэтага часу гэты старшыня сядзеў у сваім кабінеце і чакаў... указанняў з Масквы. Астатнія члены прэзідыума Клубнікаў і Карніловіч толькі ўчора выехалі на раён для таго, каб зрабіць справаздачы. Але-ж яны ніяк не могуць зразумець, што ў сваіх справаздачах перад членамі саюза яны павінны будуць даць адказ, як яны змагаюцца за рэалізацыю рашэнняў пленума.

Што-ж могуць сказаць кіраўнікі ЦК саюза лесапілення сваім выбаршчыкам?

Намеснік старшыні саюза работнікаў Дзяржтандлю т. Варабейчык даў нам дзве афіцыяльныя спраўкі: першая — што рашэннем прэзідыума ад 19 мая разасланы цыркуляр усім... усім... усім... «Прапрацаваць асноўнае з рашэнняў пленума ў кожным магазіне, базе, складзе, правесці нараду..., разгарнуць крытыку мясцкомаў. Вынікі павінны быць абагулены і прадстаўлены ў ЦК саюза к 5 чэрвеня».

І другое, — працягвае т. Варабейчык, — «даных у нас яшчэ няма і мы не ведаем, што робіцца ў нізах».

У гэтым цэнтральным праўленні ёсць чатыры чалавекі, прымацаваныя да менскіх нізавых камітэтаў. Але яны таксама не ведаюць. Тав. Варабейчык не пацікавіўся нават, што робіцца бліжа каля яго, у такой буйнейшай арганізацыі, як Дзяржаўны універмаг.

25 мая павінна была адбыцца нарада Сталінскага райкома саюза, дзе т. Варабейчык асабіста будзе «прапрацоўваць» мясцкомы за іх пасіўнасць. Такі твар закасцянелага габінетчыка, адарваўшагася ад мас.

Замест жывой дапамогі нізавым работнікам, людзі тут займаюцца пісанінай шматлікіх, бясконца доўгіх пыркуляраў, без усякага кантролю за іх выкананнем, не арганізуючы дапамогі там, дзе гэта патрэбна.

«Пісьмовыя ўказанні» даў таксама Беларускі рэспубліканскі камітэт саюза хлебапячэння. Тав. Астапчук (намеснік старшыні) таксама не палічыў патрэбным паказацца на прадпрыемствах і не ведае, як там ідзе «прапрацоўка». У некаторых мясцах збіраліся прафактывы. Што там гаварылі, якія пытанні ўзнімалі члены саюза—аб гэтым не ведае Астапчук.

У такім-жа стылі працуюць кіраўнікі ЦК саюза цагельнікаў. Намеснік старшыні т. Бахрах гаворыць, што яны намячалі склікаць у Менску профактыў, але-ж у сувязі з пленумам ЦК саюза адклалі. Цікава, чым гэта перашкаджае адно другому.

З Масквы яны атрымалі ўказанне, каб ніякіх «перабудоў» не рабіць да сканчэння пленума. І тут нічога не робіцца.

Зусім ясна, што ў цэнтральных праўленнях саюзаў рашэнні пленумаў зразумелі па-свойму, як чарговы прыступ па рассылцы і размнажэнню бюракратычных паперак і гэтым самым гробяць жывую справу.

Кожны член саюза павінен добра ўясніць рашэнні пленума ВЦСПС і змагацца за іх правядзенне ў жыццё. Пярэйшы абавязак кіраўнікоў профсаюзных арганізацый, пачынаючы ад цэнтральных праўленняў і канчаючы заўкомамі, дабіцца гэтага. Толькі пры гэтай умове можна забяспечыць сапраўдны паварот у рабоце профсаюзаў.

І. ТУРЭЦКІ.

# МЯДЗВЕЖАЯ АПЕРАТЫЎНАСЦЬ

Лінейны камітэт чыгуначнікаў менскага аддзялення службы эксплаатацыі — параўнаўча малады прафорган. Ён створан у чэрвені 1936 года. Але не гледзячы на сваю маладосць, ён мае ў сабе ўсе хваробы, якія перажываюць зараз профсаюзы.

Ці трэба больш яркага сведчання таму, як той факт, што лінком нават не арганізаваў папулярызацыю пастаноў пленума ВЦСПС, якія кладуць новую веху ў гісторыю совецкага профруху. Да гэтага часу члены профсаюза менскага аддзялення эксплаатацыі не ведаюць аб пастановах гэтага пленума. Старшыня лінкома тав. Корзун апраўдваецца тым, што ён быў на пленуме ЦК саюза. А дзе-ж быў прэзідыум лінкома, намеснік старшыні тав. Ярашэвіч, дзе быў палітаддзел?

Замест аператыўнай арганізацыі вывучэння важнейшых пастаноў сярод шырокіх мас членаў профсаюза, тут толькі збіраюцца склікаць інструкцыйную нараду старшынь мясцкомаў, каб даць «установу», напісаць чарговы дакумент, які павінен будзе засведчыць аб кіраўніцтве нізавымі прафоргамі.

Пасля гэтага не цяжка зразумець увесь стыль работы лінкома. У склад пленума лінкома ўваходзіць 17 чалавек, але да работы яны не прыцягваюцца. Тав. Корзун прызнае, што ў гэтым віна прэзідыума і асабіста яго, як старшыні. Але аднаго прызнання мала. Трэба аператыўна выпраўляць недахопы.

Ні пры лінкоме, ні пры мясцовых камітэтах няма добраахвотнага актыва. Фармальна лічацца створанымі сектары пры мясцкомах і лінкоме. Але на справе ні адзін з іх не працуе.

Лінком прымірыўся з бяздзейнасцю раду нізавых прафорганаў. Мясцком станцыі Менск-пасажырская, які ўзначальваецца членам партыі т. Войтка, ніякай работы не праводзіць. Аднак ні лінком, ні партыйная арганізацыя не лічаць неабходным заняцца гэтым пытаннем. Не выклікае ніякай трывогі і тое, што мясцком праваднікоў абсалютна бяздзейнічае. Лінком не рэагуе і на той бюракратызм, якім суправаджаецца прыём у члены профсаюза. На станцыях Калодзішчы, Жодзіна месяцамі ляжаць неразгледжанымі заявы рабочых аб прыёме іх у члены саюза. Нават паблізу лінкома—у мясцкоме аддзялення эксплаатацыі (старшыня МК Фёдараў) заявы аб прыёме ў члены профсаюза праляжалі больш месяца. На паступаючыя сігналы аб гэтым лінком рэагуе па-сямейственаму, не прыцягнуўшы да парадку абюракраціўшыяся чыноўнікаў.

Ёсць на чыгуначным вузле клуб. У верасні мінулага года было нават абрана праўленне. Але яно збіралася толькі адзін раз для... размеркавання абавязкаў. На гэтым уся работа была закончана. Характэрна прывесці склад праўлення: старшыня праўлення — начальнік аддзялення Фралоў, члены праўлення—старшыня лінкома, начальнікі ўсіх служб аддзялення, намеснік начальніка палітаддзела, галоўбух магазіна запасных частак і толькі адзін радавы член профсаюза — старшы стрэлачнік. Атрымаўся хутчэй совет гаспадарнікаў, чым орган кіраўніцтва культработай. І, натуральна, ніякай работы яны не праводзяць.

Зусім слаба ідзе барацьба за ахову працы членаў профсаюза. На барысаўскім шпалярэзным заводзе ў выніку выключна дрэннага становішча тэхнікі бязапасенасці, злачынных адносін да забеспячэння спецвопраткай рабочых амаль кожны дзень бываюць выпадкі абпалаў. Але лінком усю барацьбу з гэтым вядзе шляхам... грашовых штрафаў, не ўзняўшы гэта пытанне на належную вышыню.

Для таго, каб па-сапраўднаму перабудаваць прафработу, каб давесці рашэнні пленума ВЦСПС да кожнага члена профсаюза, патрэбна, каб палітаддзел аддзялення не стаяў у баку ад гэтай важнейшай справы, як гэта было да гэтага часу.

Р. Д.

# ДЗІЎНАЕ МАЎЧАННЕ

Пасля апублікавання рэзалюцыі VI пленума ВЦСПС аб справаздачах і выбарах профсаюзных органаў прайшло зусім дастаткова часу для таго, каб партыйныя і профсаюзныя арганізацыі наладзілі шырокае абмеркаванне важнейшых палітычных рашэнняў сярод масы рабочых.

Аднак, на многіх прадпрыемствах буйнейшых прамысловых цэнтраў рэспублікі (Менск, Віцебск, Гомель) абмежаваліся толькі чыткай рэзалюцыі, а дзе-ні-дзе адклалі гэту справу да выбараў.

На такую-ж пазіцыю сталі газеты «Ленінскі прызыў», «Комунар Магілеўшчыны» (Брылон), «Большэвік Палесся» (Гольшварц). Яны не знайшлі патрэбным хоць-бы адным словам абмовіцца аб рабоце профсаюзаў на месцах, аб падрыхтоўцы да выбараў і цэлага раду іншых пытанняў, прыведзеных у рашэннях пленума.

Бясспрэчна, што на прадпрыемствах і ўстановах даных гарадоў ёсць нямала агідпасцей у рабоце профсаюзных арганізацый, якія неабходна выкрываць перад усёй совецкай грамадскасцю. Рашэнні пленума патрэбна давесці да кожнага члена профсаюза — такая задача большэвіцкага друку.

Зусім дзіўнае, неапраўданае маўчанне праяўляюць рэдактары гэтых газет.

*Абмеркаванне пытанняў трэцяга пяцігадовага плана*

# Выраб вяжучых і новых матэрыялаў на базе мясцовай прамысловасці

...касць і якасць будаўнічых матэ...ы, выпускаемых існуючымі заводамі, ...ай, і абліцовачнай цэглы не зада...е запатрабаванняў будаўніцтва і та... БССР штогодна завозіцца з суседніх ...ік значны процант вяжучых і ін...ідаў матэрыялаў (каналізацыйныя ... пліткі і т. д.).

## СІЛІКАТНАЯ ЦЭГЛА

...ворчасць сілікатнай цэглы ў БССР ...нтравана на двух заводах — аршан...клімавіцкім, з агульнай гадавой ...ыйнасцю каля 25 млн. штук.

...я нязначная гадавая прадукцыя ...заводаў, безумоўна, не задаволіць за...ванні краіны ў трэцяй пяцігодцы ...цэглай. Канцэнтрацыя сілікатнай цэг...ключаецца ў тым, што будынкі, па...ныя з яе, маюць прыгожы знешні ..., не патрабуюць вельмі дэфіцытнага ... або іншага віду абліцовачных ма...аў.

...атныя заводы могуць працаваць ... год. Сілікатная цэгла каштуе та...чайнай будаўнічай.

...ідацыя вузкіх месц па існуючых сі...ых заводах, у асаблівасці па клімаў (устаноўка дадатковых двух прэ...скапчэнне кацельнай), дае магчы...у першы-ж год трэцяга пяцігоддзя ...ыць выпуск прадукцыі ў 3—4 ра...ы нязначных дадатковых затратах.

...пасылка для пабудовы новых заво...ікатнай цэглы ў нашай рэспубліцы ... вялікая, бо асноўная сыравіна для ... віду вытворчасці (пясок і гра...ырока распаўсюджана ў БССР.

...прадстаўляе асаблівых затрудненняў ...ніе гэтых заводаў вапнай—састаў...ствай сілікатнай цэглы. У сучасны ... нашы заводы прымяняюць чыстую ... атрымліваемую шляхам апалу бе...х крэйд, або завазімую з Украіны. ...ма замены чыстай вапны даламіты...ы, вырашаная сілікатнымі заводамі ...кай вобласці, значна пашырыць па...творчыя магчымасці. Пераход заво... даламітызаваную вапну, атрымліваемую абпалам вапнякоў, часта залягаючых недалёка ад запасаў пяску і гравія, пазбавіць некаторыя заводы ад неабходнасці дастаўкі чыстай вапны здалёку (аршанскі сілікатны завод).

Атрыманне прыгожай, афарбаванай у розныя колеры сілікатнай цэглы шляхам дабаўкі неарганічных фарбавальнікаў, з'яўляецца справай простай і павінна быць ажыццёўлена на нашых сілікатных заводах у бліжэйшы час.

## БЛОКІ

Скарыстанне тарфянога попелу, звалёнага на тэрыторыях заводаў Менска, Магілева, Оршы (БелДРЭС) і іншых, у трэцім пяцігоддзі павінна быць вырашана для атрымання будаўнічага матэрыялу — блокаў (цэгла вялікіх размераў), для вытворчасці якіх патрабуецца 75 проц. попелу і 25 проц. даламітызаванай вапны. Практычнае вырашэнне гэтай нескладанай праблемы значна павялічыць рэсурсы нашых будаўнічых матэрыялаў.

## ВЯЖУЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Яшчэ больш востра стаіць пытанне снабжэння нашых пабудоў вяжучымі матэрыяламі — вапнай і цэментам. Адзіны, больш-менш механізаваны, завод па абпалу даламітызаванага вапняка Вярхоўе—Левая Руба ўблізі Віцебска, размешчаны ля значнай сыравіннай базы в. Цякава, Койтава і інш., мае шырокія перспектывы на пашырэнне і рэканструкцыю. Пашырэнне і рэканструкцыя павінна пайсці па лініі пабудовы новых шахтных пячэй і механізацыі здабычы і дастаўкі сыравіны. Завод Вярхоўе—Левая Руба, які працуе на базе даламітызаванага вапняка, мае ўсе даныя для атрымання гідраўлічнай вапны, так неабходнай нашым гідратэхнічным пабудовам.

Абпал вапны з рыхлай крэйды мергеляў распылен па многіх дробных заводах і саматужных промарцелях, пазбаўленых механізацыі. З саматужніцтвам і сезоннасцю ў атрыманні вапны з крэйды і мергеляў у трэцяй пяцігодцы павінна быць пакончана. Прымітыўныя напаўненні печы неабходна замяніць шахтнымі печамі з напярэдняй брыкетыроўкай крэйды.

У трэцяй пяцігодцы атрыманне вапны з крэйды павінна быць сканцэнтравана на заводах, маючых вялікія сыравінныя базы (Быхаў, Клімавічы, Дзяржынск, Чачэрск, Гомель). На гэтых заводах павінна быць праведзена поўная механізацыя і ліквідавана сезоннасць работ.

Канцэнтрацыя вытворчасці вапны на буйных заводах дасць магчымасць у трэцяй пяцігодцы вырашыць праблему выкарыстання вуглекіслага газа, які выдзяляецца пры абпале вапны для патрэб харчовай прамысловасці.

Вытворчасць цэменту да гэтага часу сканцэнтравана ў БССР на адзіным крычаўскім цэментным заводзе.

Між тым, наша рэспубліканская прамысловасць мае поўную магчымасць стварыць камбінат па выпуску цэменту, вапны, цэглы і чарапіцы ў раёне станцыі Шасцероўка на базе велізарных запасаў крэйды, гліны і трэпелаў, якія з'яўляюцца па свайму хімічнаму складу добрай сыравінай для атрымання добраякаснага цэменту. Запасы гэтага месцанараджэння з'яўляюцца невычарпальнымі: крэйды — 3 млн. тоны, гліны для цэменту — 760.000 тон, гліны шэрай для выпрацоўкі высокаякасных цэглы і чарапіцы — 1.400.000 тон. Аднак, гэтымі запасамі рэсурсы раёна не абмяжоўваюцца. Даследчымі работамі ахоплена толькі нязначная плошча ўчастка месцанараджэння, даўшая гэтыя лічбы. Далейшае геалагічнае вывучэнне раёна безумоўна павялічыць у некалькі разоў сыравінныя рэсурсы раёна, бо ўсе прадпасылкі для гэтага ў наяўнасці.

Паказаныя запасы, нават не ўлічваючы магчымасці пашырэння, забяспечваюць работу буйнага цэментнага завода на поўны амартызацыйны тэрмін.

Водныя рэсурсамі, вельмі неабходнымі для нармальнай работы буйнага цэментнага завода, раён у поўнай меры забяспечан, а прычыны паўнасці рэкі Асцёр і магчымасці атрымання вады з артэзіянскіх калодзежаў.

Прадпасылкі для пабудовы цэментных заводаў мясцовага значэння ёсць і ў іншых раёнах БССР (Гомель, Быхаў, Чачэрск).

## НОВЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Развіццё комунальнага, санітарнага будаўніцтва ў харчовай прамысловасці (бойні, халадзільнікі, лазні, больніцы і т. д.) адкрывае шырокія магчымасці развіцця вытворчасці абліцовачных і новых матэрыялаў. Адным з буйнейшых заводаў абліцовачных плітак і кафеля ў СССР з'яўляецца копыскі кафельна-плітачны завод. Другі невялікі завод абліцовачных плітак знаходзіцца ў Менску. Вялікія запасы высокаякаснай гліны каля горада Копысь далі падставу запраектаваць рэканструкцыю і значнае пашырэнне існуючага там кафельна-плітачнага завода.

Аднак, пытанне аб рэканструкцыі завода, узнятае некалькі год таму назад, да гэтага часу далей складання праекта не пайшло. Між тым уключэнне завода ў сетку БелДРЭС'а значна пашырыць яго вытворчыя магчымасці і палепшыць якасць прадукцыі. Адным з вузкіх месц, вельмі тармозячых работу завода, з'яўляецца неабходнасць ужывання дэфіцытных імпартных металаў — свінца і волава для глазіроўкі абліцовачных плітак і кафелю. Таму адной з асноўных задач, якія стаяць перад заводам у трэцяй пяцігодцы, з'яўляецца пераход на так званую бессвінцовую глазур. Састаў такой глазуры, распрацаваны навукова-даследчым інстытутам прамысловасці і лабараторыяй завода, даў станоўчыя вынікі пры праверцы яго ў заводскіх умовах і павінен быць неадкладна ўкаранён у вытворчасць. Ліквідацыя разрываў паміж пячной і сушыльнай гаспадаркай пры нязначных затратах дасць магчымасць заводу ў першы-ж год трэцяй пяцігодкі павялічыць выпуск прадукцыі ў 2—3 разы.

Узросшыя мастацкія запросы працоўных не могуць быць задаволены стандартнымі белымі кафелямі для абліцоўкі пячэй. Завод павінен аднавіць раней практыкаваны выраб мастацкіх кафляў па заказу спажыўца. Вялікая частка вырабаў копыскага завода мае збыт за межамі БССР, у выніку чаго ўзнікае пытанне аб павелічэнні вытворчасці абліцовачных плітак і кафляў у тры-чатыры разы.

У выкананне пастановы партыі і ўрада ад 11 лютага 1936 года аб павелічэнні выпуску абліцовачных матэрыялаў неабходна ў трэцяй пяцігодцы пабудаваць новыя заводы на базе налўнай сыравіны ў раёне гарадоў Жлобіна і Віцебска.

***

Развіццё прамысловасці, рост дабрабыту гарадоў нашай краіны прад'яўляюць патрабаванні не толькі на цэглу, абліцовачныя і вяжучыя матэрыялы, але і ў цэлым радзе іншых вырабаў, якія могуць быць выпрацаваны на базе мясцовай сыравіны (каналізацыйныя трубы, пліткі для падлогі, вогнеўпоры і т. д.). Праведзеныя ў другой пяцігодцы даследчыя работы даюць поўную падставу сцвярджаць, што сыравіна, неабходная для арганізацыі гэтых відаў матэрыялаў, ёсць у дастатковай колькасці.

У Копыскім раёне, недалёка ад кафельна-плітачнага завода, выяўлены запасы сыравіны, прыгоднай для выпрацоўкі каналізацыйных труб і метлахскіх (падлогавых) плітак. Пытанне аб арганізацыі на копыскім заводзе цэха каналізацыйных труб і метлахскіх плітак, якое дабатуецца другі год, павінна быць вырашана станоўча ў першы-ж год трэцяга пяцігоддзя. Адначасова неабходна вырашыць пытанне пабудовы камбіната па выпрацоўцы труб, плітак і вогнеўпору на базе месцанараджэння «Ляхава гара». Запасы гэтага месцанараджэння забяспечаць бесперабойную работу завода сярэдняй прадукцыйнасці на доўгі час.

Значныя запасы дробна-зярністых пескоў, вялікая колькасць кардонных і папяровых фабрык на тэрыторыі БССР ствараюць прадпасылкі для арганізацыі толевых матэрыялаў.

Чавускае месцанараджэнне вогнетрывалых глін пры правядзенні неабходных меліяратыўных работ, можа быць выкарыстана як база для арганізацыі завода шамотнай цэглы сярэдняй магутнасці.

Оўрудкае месцанараджэнне мае патрэбную сыравіну для вырабу другога віду вогнетрывалаў — дынасавай цэглы.

Рэалізацыяй усіх гэтых задач, у першую чаргу павінен заняцца ўноў арганізаваны трэст вяжучых і пругдных матэрыялаў Наркаммясцпрома.

Інжынеры: А. ШЗВЕЛЬКО.
А. ПОЗНЯК,
А. МАЛАМА.

# НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

## Наступленне рэспубліканскіх войск у раёне Гвадалахары

**МАДРЫДСКІ ФРОНТ**

23 мая рэспубліканскія войскі на гвадалахарскім фронце (на паўночны ўсход ад Мадрыда) заняли 7 вёсак, размешчаных на ўсход ад Сіфуэнтэс.

Рэспубліканцы прасунуліся ў гэтым сектары на 10 кіламетраў. Пасля энергічнай артылерыйскай падрыхтоўкі 20 танкаў пачалі прасоўванне па шырокаму фронту да траншэй мяцежнікаў. За танкамі ішлі шматлікія аўтамабілі, якія хутка пераходзілі да намечаных пунктаў атрады рэспубліканскіх салдат. Танкавая атака захапіла мяцежнікаў знянацку, і яны пасля вельмі слабага супраціўлення пачалі хутка адступаць. Рэспубліканская пяхота паступова займала пазіцыі, якія мяцежнікі ў беспарадку пакідалі. Рэспубліканцы захапілі кулямёты, аўтаматычныя вінтоўкі, мартыры і скрыні са снарадзеннем. У вёсцы Торэкадрылья, а таксама ў вёсцы Отэро захвачана вялікая колькасць грузавікоў мяцежнікаў.

Згодна апошніх вестак, войскі мяцежнікаў, якія прымалі ўдзел у гэтым баі, складаліся з мараканцаў і італьянскіх салдат.

***

**ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ**

Як паведамляе агенцтва Гавас, баі, якія адбываліся 23 мая ў сектары Дзіма, вызначаліся крайняй бязлітаснасцю. Мяцежнікі працяжвалі свае атакі пры падтрымцы інтэрвентаў. Узвышша Дзіма паранейшаму астаецца ў руках рэспубліканцаў. У Мунгіі — пажары, выкліканыя запальваючымі бомбамі мяцежнікаў.

Згодна зводкі міністэрства абароны ад 24 мая, рэспубліканская артылерыя знішчыла парахавыя склады ў Овіедо.

Фашысцкія самалёты 23 мая бамбардыравалі Сантандэр (порт на ўзбярэжжы Біскайскага заліва). Ранена вялікая колькасць дзяцей.

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 24 мая. (БЕЛТА). Учора самалёт мяцежнікаў свінуў у парту Більбао бомбу, якая ўпала побач з англійскім параходам «Ок гров». Параход атрымаў нязначныя пашкоджанні. Ранены 2 англійскія матросы.

## Мітынг соцыялістычнай моладзі Валенсіі

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 24 мая. (БЕЛТА). Учора тут адбыўся мітынг федэрацыі аб'яднанай соцыялістычнай моладзі. На мітынгу прысутнічала каля 2.500 чалавек.

Прадстаўнік швейцарскай соцыялістычнай моладзі, вітаючы сабраўшыхся, заявіў, што ў Іспаніі ён усвядоміў усю гнуснасць адрадзіцкай дзейнасці трацкістаў.

З вялікай прамовай выступіў генеральны сакратар федэрацыі аб'яднанай соцыялістычнай моладзі Карыльо. Карыльо заявіў, што федэрацыя аб'яднанай соцыялістычнай моладзі стаіць за аб'яднанне ўсёй антыфашысцкай моладзі і што баскія каталікі, якія абараняюць Іспанію, бліжэй да соцыялістычнай моладзі, чым псеўдарэволюцыянеры, якія з'яўляюцца ворагамі народнага фронта.

У заключэнне Карыльо патрабаваў роспуску трацкісцкіх арганізацый.

На мітынгу было агалошана шмат прывітанняў з фронта ад імя цэлых часцей. Усе прывітанні змяшчалі патрабаванне неадкладнай ліквідацыі трацкісцкай ПОУМ, як фашысцкай агентуры генерала Франко.

У заключэнне старшыня мітынга агаласіў паведамленне аб бліскучай перамозе совецкіх палярнікаў. Гэта паведамленне было сустрэта бурнымі апладысментамі.

## Прабыванне тав. Літвінава ў Жэневе

ЖЭНЕВА (горад у Швейцарыі, месца прабыванне Лігі нацый), 24 мая. (БЕЛТА). Сёння раніцою народны камісар замежных спраў тав. Літвінаў прыняў міністра замежных спраў Латвіі Мунтэрса. Пасля снядання тав. Літвінаў меў доўгую гутарку з турэцкім міністрам замежных спраў Тэфік Рушдзю Арасам. Сёння вечарам, пасля сканчэння пасяджэння Совета Лігі нацый, тав. Літвінаў меў доўгую гутарку з дэлегатам Іспаніі Альварэсам дэль Вайо.

## АДКРЫЛАСЯ СУСВЕТНАЯ ВЫСТАЎКА У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 24 мая. (БЕЛТА). Сёння ў прысутнасці прэзідэнта рэспублікі Лебрэна, старшыні совета міністраў Блюма, членаў французскага ўрада, дыпламатычнага корпуса, генеральных камісараў замежных павільёнаў і шматлікіх гасцей пачалася ўрачыстая цэрэмонія адкрыцця сусветнай выстаўкі. Пляцоўка Трокадэро і «Калона міру» дэкарыраваны флагамі краін, якія прымаюць удзел у выстаўцы.

Бліскучае ўражанне сваёй закончанасцю і цэласнасцю робіць совецкі павільён. Многія з іншых замежных павільёнаў к афіцыяльнаму адкрыццю выстаўкі яшчэ не дабудаваны, у прыватнасці, павільёны Англіі, ЗША і інш.

Пасля агляду выстаўкі прэзідэнт рэспублікі, члены французскага ўрада, дыпламатычны корпус, генеральныя камісары замежных павільёнаў і госці накіраваліся ў вялікі палац, дзе завяршаецца цэрэмонія адкрыцця выстаўкі. З прамовамі, прысвечанымі адкрыццю выстаўкі, выступілі прэзідэнт Лебрэн, міністр гандлю і прамысловасці і генеральны камісар выстаўкі.

Адкрыццё выстаўкі было азнаменавана гарматным салютам. Быў зроблен 101 стрэл.

25 мая ў другой палове дня 10 варот выстаўкі адкрываюцца для доступу публікі. У гэты-ж дзень адкрыецца совецкі павільён.

## АДСТАЎКА БАЛДУІНА

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 24 мая. (БЕЛТА). Балдуін уйдзе ў адстаўку з паста прэм'ера 28 мая. Згодна вестак агенцтва Рэйтэр, Балдуін увойдзе ў палату лордаў з тытулам герцага. Прэемнікам Балдуіна будзе Невіль Чэмберлен (цяперашні міністр фінансаў). Джон Саймон (цяперашні міністр унутраных спраў) зойме пост міністра фінансаў. Як указвае агенцтва, не чакаецца ніякіх змен у кіраўніцтве міністэрствам замежных спраў.

Тав. Дзердзеўскі (справа)—сіноптык паўночнай экспедыцыі, перад вылётам атрымлівае на Маскоўскім аэрадроме ўказанні аб надвор'і.

Фото В. Фішмана (СФ).

# ВОДГУКІ ЗАМЕЖНАГА ДРУКУ НА ПЕРАМОГУ СОВЕЦКІХ ПАЛЯРНІКАЎ

### ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 24 мая. (БЕЛТА). Радыкал-соцыялістская газета «Эр нувель» змяшчае поўны захаплення артыкул, прысвечаны бліскучай перамозе совецкай паўночнай экспедыцыі. «Экіпаж пяці самалётаў, — піша газета, — праявіў незвычайную мужнасць, каб даць магчымасць групе вучоных ажыццяўляць наглядання ва ўмовах, у якіх яшчэ ніколі ніхто не працаваў. Гэта стала магчымым толькі дзякуючы стараннай падрыхтоўцы, наяўнасці высокаякаснай авіяцыі і лётчыкаў, якія выклікаюць захапленне сваёй падрыхтоўкай і адвагай. Гэта стала магчымым таксама дзякуючы наяўнасці вучоных, намаганні якіх зноў дэманструюць размах навуковай работы ў Совецкім Саюзе.

Усё гэта павінна нас бурна радаваць. Мы не забываем аб дагаворах, якія звязваюць Францыю і Совецкі Саюз. Усё тое, што сведчыць аб бліскучай арганізацыі, добрым тэхнічным аснашчэнні, інтэлектуальнай і маральнай цэннасці вялікай нацыі, з якой мы звязаны агульнай адпаведнасцю справе міру, не можа прымацца намі інакш, як з глыбокім задавальненнем.

### ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА, 23 мая. (БЕЛТА). Усе чэхаславацкія газеты друкуюць сёння падрабязную інфармацыю аб совецкай палярнай экспедыцыі, адзначаючы яе велізарнае міжнароднае значэнне. Рад газет змяшчае біяграфіі тт. Шмідта і Вадап'янава.

Газета «Прагер тагеблат» публікуе паведамленне аб перамозе совецкіх палярнікаў пад загалоўкам: «Найвялікшы подвіг совецкіх лётчыкаў».

«Экспедыцыя Шмідта, — піша газета, —мае такое-ж значэнне, якое ў свой час мела адкрыццё самога Паўночнага полюса.

### БЕЛЬГІЯ

БРУСЕЛЬ, 24 мая. (БЕЛТА). Усе газеты друкуюць паведамленні аб гераічнай экспедыцыі тав. Шмідта на Паўночны полюс. Газеты адводзяць гэтым паведамленням самае віднае месца і змяшчаюць іх пад буйнымі загалоўкамі, падкрэсліваючы тым самым значэнне, якое прыдаецца ў Бельгіі гэтай новай перамозе совецкай навукі і авіяцыі.

### АНГЛІЯ

ЛОНДАН, 24 мая. (БЕЛТА). Совецкая экспедыцыя на Паўночны полюс паранейшаму прыцягвае вялікую ўвагу англійскага друку. Газеты шырока публікуюць перадачы палярнай станцыі «Паўночны полюс» і прывітанне, пасланае заваёўцам полюса кіраўнікамі ВКП(б) і совецкага ўрада. Маскоўскі карэспандэнт органа профсаюзаў «Дэйлі геральд» падрабязна апісвае падрыхтоўку да экспедыцыі — адзенне, прадукты харчавання, абсталяванне і т. д.

Паводле слоў карэспандэнта, гісторыя гэтых падрыхтаванняў «чытаецца, як раздзел з рамана Жуль Верна». Карэспандэнт заклікае брытанскіх радыёаматараў лавіць паведамленні самай паўночнай у свеце радыёстанцыі.

Агенцтва Рэйтэр у шырокім паведамленні прыводзіць поўны тэкст першай радыёграмы заваёўцаў Паўночнага полюса і дае агляд планаў экспедыцыі і папярэдніх дасягненняў совецкай авіяцыі ў палярных раёнах.

Орган англійскай кампартыі «Дэйлі уоркер» у перадавым артыкуле ўказвае, што пералёт на Паўночны полюс прыбаўляе новы трыумф да бліскучай гісторыі совецкай авіяцыі. «Гэта дасягненне», — піша газета, — яркае сведчыць аб якасці совецкай авіяцыі — яе матэрыяльнай часткі і аб якасці совецкіх лётчыкаў-даследчыкаў». Усе, хто запікаўлен у чалавечым прагрэсе, — заключае газета, — будуць вітаць апошнюю перамогу СССР, якая павінна натхніць на шчэ большыя намаганні, накіраваныя на вызваленне ўсяго чалавецтва.

### ТУРЦЫЯ

АНКАРА, 23 мая. (БЕЛТА). Паведамленне аб пасадцы на Паўночным полюсе самалёта «СССР Н-170» у колах турэцкай грамадскасці сустрэта з вялікай цікавасцю. Першыя паведамленні аб палёце тав. Вадап'янава і ўдачнай пасадцы самалёта з'явіліся на відным месцы яшчэ амаль ва ўсіх вячэрніх стамбульскіх газетах.

Сёння ў газеце «Улус» змешчаны падрабязныя паведамленні аб першых мерапрыемствах экспедыцыі, а таксама матэрыялы аб яе мэтах і падрыхтоўцы. Газета на першай старонцы змяшчае партрэт тав. Шмідта.

# ЛІБРЭТА НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ОПЕРЫ

У лібрэта для новай беларускай оперы, якое я напісаў, я ставіў сваёй задачай паказаць рост беларускага батрака-рэволюцыянера. Дзея разгортваецца на фоне канца імперыялістычнай вайны і прыходу Кастрычніка. Мне хацелася ў сваім лібрэта выкарыстаць багацце беларускага народнага фальклора і паказаць праўдзіва пацазеі, якія адбываліся ў прыфронтовай вёсцы таго часу. Я думаю, што мы ў сумесной рабоце з кампазітарам Цікоцкім, які піша музыку, і ў песным супрацоўніцтве з Тэатрам оперы і балета зможам стварыць каштоўную сучасную беларускую оперу.

П. БРОЎКА.

***

18 мая на нарадзе пры Кіраўніцтве па справах мастацтваў з удзелам рэжысёраў, артыстаў Тэатра оперы і балета, паэтаў і пісьменнікаў адбылася чытка лібрэто П. Броўка. Па агульнай думцы выступаўшых таварышоў лібрэта з'яўляецца новым творчым дасягненнем паэта і вялікую каштоўнасць для стварэння беларускай оперы.

Лібрэта ўхвалена Кіраўніцтвам на справах мастацтваў. Музыку оперы піша кампазітар Цікоцкі.

## ПОСПЕХ ФІЛЬМА „КАНЦЭРТ БЕТХОВЕНА" ЗА ГРАНІЦАЙ

Вядомы фільм вытворчасці Белдзяржкіно «Канцэрт Бетховена» (рэжысёры тт. Шмітгоф і Гаўронскі) з вялікім поспехам дэманструецца на заграніччных экранах. Карціна дэманстравалася ўжо ў Злучаных Штатах Амерыкі і Чэхаславакіі, зараз яна анансіруецца ў Англіі і Францыі. Фільм прадан раду краін — Бельгіі, Даніі, Галандыі і інш. Асаблівы поспех фільм меў у Злучаных Штатах Амерыкі. Амерыканскі друк даў аб ім вельмі добры водгук.

Буйнейшы кінематаграфічны журнал Нью-Ёрка «Мошэн Пікчэр Геральд» у нумары ад 10 красавіка піша: «Фільм паказвае СССР, як краіну, дзе заахвочваюцца і працвітаюць юныя таленты, неаспрэчны факт даказан дасягненнямі совецкіх музыкантаў»...

Газета «Геральд трыбюн» у нумары 7 красавіка піша: «Натуральная ўласць, якую ўносяць совецкія дзеці, гэты фільм, рэзка адрознівае іх ад пышлівых «цудоўных дзяцей» амерыканскай кінематаграфіі»...

«Нью-Ёрк пост», параўноўваючы гэты фільм з амерыканскімі дзіцячымі карцінамі, высмейвае амерыканскіх дзяцей, з «на экране ўсе прыгожанькія і амаль аднолькавай ступені непрыемна ненатуральны і разумны». У параўнанні з лучшымі фільмамі Злучаных Штатаў Амерыкі — заўуляе газета — «Канцэрт Бетховена» — выдатнае коўшаства, поўнае гумару і драматызму.

## ПАДРЫХТОЎКА ДА XVII ГАДАВІНЫ ВЫЗВАЛЕННЯ БССР АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

**СТРАЛКОВЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ**

Адзначаючы XVII гадавіну вызвалення БССР ад белапалякаў, Цэнтральны совет Асоавіяхіма Беларускія спартыўна-стралковыя спаборніцтвы. Спаборніцтвы пачнуцца 11 ліпеня. У іх прымуць удзел пастаянныя каманды варашылаўскіх стралкоў першай і другой ступені. Праграма спаборніцтваў астаецца такой-жа, як і ў дзень совецкага стралка.

## РЭКАНСТРУКЦЫЯ МАГІСТРАЛІ МАСКВА—НЕГАРЭЛАЕ

Па рашэнню ўрада ў гэтым годзе павінна быць праведзена рэканструкцыя чыгуначнай магістралі Масква—Негарэлае. На ўсёй працягласці шляху будуць заменены рэйкі, шпалы, увесь шлях павінен быць пастаўлен замест пяцчанага на шчэбёначны баласт. Работы будуць вытвараецца на абодвух шляхах адначасова, прычым без усякага парушэння руху паездоў. Пасля рэканструкцыі паезды напраўлення Масква—Негарэлае змогуць рухацца 140 кіламетраў у гадзіну з павялічаным саставам і грузапад'ёмнасцю.

Рэканструкцыя магістралі — адказная і вялікая задача. Дастаткова сказаць, што на адзін участак Негарэлае—Смалявічы павінна быць завезена 20 тысяч вагонаў шчэбню. Зараз праводзіцца ўзмоцненая падрыхтоўка да развароту работ, якія поўным ходам распачнуцца з 1 чэрвеня. На участак Негарэлае—Асінаўка пачалася завозка рэек, шчэбню і шпал. Прыбылі 4 машынашляхавыя станцыі, у якіх ёсць балластыровачныя машыны для пад'ёмкі шляхоў і ўкладкі шчэбню, механічныя падбойнікі, шляхавыя стругі для выпраўлення адкосаў і інш.

## НА ЛЕСАСПЛАВЕ

На 20 мая па рэках БССР пушчана ў сплаў 1 мільён 177 тысяч кубаметраў лесу, што складае 106 проц. выканання календарнага плана. Да канечных пунктаў прыбыла 674 тысячы кубаметраў. Адсталі ў выкананні сваіх планаў Вялыніцкі і Лепельскі леспрамгасы і Віцебскі лесараён. Наперадзе ідуць Мозырская сплаўкантора, па якой календарны план пуску ў сплаў выкаран на 144 проц. і Бабруйская — на 127,8 проц.

## ЭСТАФЕТА „КОМСОМОЛЬСКОЙ ПРАВДЫ"

625 фізкультурнікаў Менска прынялі ўдзел 24 мая ў эстафеце на прыз газеты «Комсомольская правда». Пасля ўпартай барацьбы прыз заваявала каманда таварыства «Харчавік» — 27 мінут 10 сек. На другім месцы выйшла каманда таварыства «Харчавік» — 27 мінут сек., за ёю каманда медінстытута — 27 мінут 48.5. Усе гэтыя тры рэзультаты лепшы мінулагодняга часу, які паказала каманда «Дынамо» — 28 мінут 21 сек.

## НА „КУБАК СССР" ПА ФУТБОЛУ

Калі 10 тысяч гледачоў сабраліся мая на стадыёне «Дынамо» паглядзець першую гульню на «кубак СССР» па футболу. Першымі выбягаюць госці — маскоўская каманда «Дынамо», за імі — менская. Пачынаюць гульню пачалася. Спачойна і ўпэўнена гуляюць масквічы, футбалісты Менска хвалююцца і залішне мітусяцца.

Вось ля варот Масквы два разы ўзнікае небяспека, б'юць «корнер» (два штрафныя ўдар), але майстры добра ахоўваюць свой спартыўны пункт.

Толькі перад сканчэннем першага тайма (палова гульні) масквічы ўпачцільную дайшлі да варот Менска. Іх цэнтр нападу Смірноў пасылае мяч у сетку, але ударацца ў штангу варот і адскокваючы зад, яго падхватвае правы край нападу. Масквічы, які адкрывае лік 1 : 0.

У другім тайме на 14 мінуце каля варот Масквы ствараецца свалка, якую карыстоўвае менчанін Лахонін. Ён скарыстоўвае ступені і ўдарыў мяч. Лік 1 : 1. Толькі на апошніх мінутах з'явілі некалькімі бліскучымі камбінацыямі паваліваюць лік. Першы мяч правага краю вядомы футбаліст Ільін. Другі мяч — левая звязка нападу Папаматаў. Амаль на апошняй мінуце ў вароты Менска з 11 метраў ляціць штрафны мяч, забівае капітан маскоўскай каманды Ільін. Маскоўская каманда «Дынамо» кідае поле пераможцам, з лікам 2 : 1. Каманда менскага «Дынамо» гэтым трыумфам выбыла з розыгрышу на кубак.

***

Менская каманда «Спартак» сустрэла ў той-жа дзень у Ленінградзе з камандай Іжорскага завода. Гэта скончылася перамогай з рэзультатам 3 : 3. Па ўмовах выгрышу кубка каманды павінны іграць паўторна, да вырашэння пераможцы.

І. ЦЫВІН.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

Даводзіцца да ведама дэпутатаў Менгорсовета, секцый: па барацьбе з беспрытульнасцю і безнаглядзнасцю, гандлёвай, аховы здароўя, што 26 мая адбудзецца ПЛЕНУМ гэтых секцый сумесна з актывам у наступных памяшканнях:

Секцыя па барацьбе з беспрытульнасцю і безнаглядзнасцю — памяшканне Горсовета, пакой № 49 — у 8 гадзін вечара.

Гандлёвая секцыя — памяшканне клуба работнікаў дзяржгандлю — рог Энгельса і Комуністычнай — у 7 гадзін вечара.

Секцыя аховы здароўя — памяшканне клуба Медсанпрацы — у 7 гадзін вечара.

У сувязі з важнасцю пытання — справаздачы бюро секцый аб рабоце за прайшоўшы перыяд—яўка ўсіх дэпутатаў і актывістаў абавязкова. Працуючыя на другіх зменах павінны быць вызвалены ад работы.

БЮРО СЕКЦЫЙ.

**РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 26 МАЯ:** 8.30—«Апошнія паведамленні». 10.30 — перадача для малодшых школьнікаў. 16 — канцэрт. 17 — перадача ў дапамогу самаадукацыі. 18.30 — завочная партыйная школа. 19.45 — канцэрт. 21 — трансляцыя з Масквы.

**СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:**

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР (БДДТ) Абан. № 117. СКУПЫ

Памяшк. Дзярж. Яўрейск. тэатра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА Абан. № 47. ЕЎГЕНІЙ ОНЕГІН

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка» ТРЫНАЦЦАЦЬ

на летняй эстрадзе — канцэрт. адда.

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» «ЖАНІЦЬБА» (па Гогалю)

на летняй эстрадзе — джаз-аркестр

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал» «ПЕТЭР»

Гукавы кінатэатр «Спартак» ГРАНІЦА

БЕЛДЗЯРЖКІНО

праводзіць з 15 чэрвеня

спецкурсы для выпускнікоў 10 класаў,

паступаючых у Маскоўскі і Ленінградскі інстытуты кінематаграфіі

на АПЕРАТАРСКІ ФАКУЛЬТЭТ,

у якім ад спецыспытаў не вызваляюцца і выдатнікі.

Паступаючыя прадстаўляюць у трэст Белдзяржкіно (Совецкая, 90) заяву, аўтабіяграфію, даведку школы з указаннем паспяховасці па прадметах.

Інстытут кінематаграфіі забяспечвае студэнтаў інтэрнатам і стыпендыяй — на першым курсе ад 109 руб. да 151 руб.

БЕЛДЗЯРЖКІНО.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЮРЫДЫЧНЫ ІНСТЫТУТ

абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ

на 1937-38 навучальны год

Інстытут рыхтуе юрыстаў для работы ў судовых органах, органах пракуратуры, следства, органах натарыята, адвакатуры і арбітража в паўным, устаноўленым для гэтых катэгорый работнікаў, тэрмінам стажыроўкі пасля сканчэння інстытута.

Прыём заяў аб паступленні будзе праводзіцца в 20 чэрвеня да 1 жніўня.

Тэрмін навучання 4 гады.

У інстытут прымаюцца асобы ад 14 да 35 год.

Паступаючыя ў інстытут павінны мець атэстат аб сканчэнні поўнай сярэдняй школы і здаць іспыты, згодна пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 23 чэрвеня 1936 года, па ніжэйказаных прадметах: а) рускай і беларускай мовах (пісьмовы твор), б) граматыцы, в) літаратуры, г) палітграмаце, д) матэматыцы, е) фізіцы, ж) хіміі, з) гісторыі, і) геаграфіі, к) замежнай мове (па адной з наступных: нямецкай, англійскай або французскай).

Асобы, якія скончылі да 1935 г. школу II ступені (дзесяцігодку) або 3-гадовыя на базе сямігодкі прафесіянальныя школы ў БССР і ў СССР, дапускаюцца да прыёмных іспытаў нарадзе са скончыўшымі дзесяцігодку.

Скончыўшыя дзесяцігодку і маючыя на асноўных прадметах адзнакі «выдатна», а па астатніх прадметах (маляванне, чарчэнне, спевы, музыка, фізкультура) адзнаку «добра», прымаюцца ў інстытут без іспытаў.

Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакументы: аўтабіяграфія, атэстат аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (у арыгінале), пашпарт (прад'яўляецца асабіста), 3 фотакарткі (здымкі без галаўнога ўбору), размерам 3х4 см. з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, завераным дзяржустановай, даведкі аб адносінах да ваеннай службы (для ваеннаабавязаных, даведка ад урача аб стане здароўя.

Усе студэнты забяспечваюцца, у залежнасці ад паспяховасці, стыпендыяй ад 90 да 200 руб. у месяц. Сямейныя інтэрнатам не забяспечваюцца.

Прыёмныя іспыты адбудуцца з 1 па 20 жніўня. Залічэнне ў лік студэнтаў з 21 па 25 жніўня.

Асобы залічаныя ў юрыдычны інстытут, але без уважлівых прычын не прыступіўшыя да заняткаў з пачатку навучальнага года, з ліку студэнтаў выключаюцца.

Заявы падаваць на імя дырэктара юрыдычнага інстытута па адрасу: Менск, Університэцкі гарадок, галоўны корпус, юрыдычны інстытут, пакой 323. Тэл. 20-753.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ТРЭСТ ЗЯЛЁНАГА БУДАЎНІЦТВА

(К. Маркса, 60. Тэл. 24-231)

ЗАКЛЮЧАЕ ДАГАВАРЫ

на ўпрыгожанне КВЕТКАМІ

фабрычна-заводскіх тэрыторый, жактаў, устаноў, школ і т. д.

АРАНЖАРЭЙНА-ПАРНІКОВЫЯ ГАСПАДАРКІ ТРЭСТА ПРАДАЮЦЬ У ВЯЛІКІМ ВЫБАРЫ

КВЕТКАВУЮ РАСАДУ

ПА ПАНІЖАНЫХ ЦЭНАХ.

РАСАДУ МОЖНА НАБЫЦЬ У САДАВОДСТВАХ ПА ВУЛІЦАХ ВАРАШЫЛАВА, 3, К. МАРКСА, 60 І Ў САДАВОДСТВЕ № 3 ПА БАРЫСАЎСКАМУ ТРАКТУ, ЗА ПАРКАМ КУЛЬТУРЫ І АДПАЧЫНКУ.

На падставе пастановы Совета Народных Камісараў БССР

БЕЛЖЫЛСАЮЗ арганізоўвае ў гг. Менску, Гомелі, Віцебску і Marinesa

ДАЧНА-БУДАЎНІЧЫЯ КААПЕРАТЫВЫ

па прынцыпах жыллёва-будаўнічай кааперацыі.

У члены кааператыва прымаюцца ўсе працоўныя, якія пастаянна пражываюць або працуюць у данай мясцовасці, за выключэннем асоб, пазбаўленых выбарчых правоў па суду.

З статутам дачна-будаўнічага кааператыва і ўмовамі кааперавання магчыма азнаёміцца ў Белжылсаюзе (Інтэрнацыянальная № 12, пакой № 1).

Папярэдні запіс для прыёму ў члены кааператыва праводзіцца ў г. Менску — Белжылсаюзам, у гг. Гомелі, Віцебску і Marinesa — горжылсаюзамі.

БЕЛЖЫЛСАЮЗ.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

# ПАСТАНОВА № 13

## ГАЛОЎНАЙ ДЗЯРЖСАНІНСПЕКЦЫІ БССР ад 21 мая 1937 г.

г. Менск

## „Аб папярэджанні магчымых выпадкаў атручвання грыбамі смарчкамі і страчкамі сярод насельніцтва"

Смарчкі і страчкі (мясцовая назва «выселкі і храпачы») з'яўляюцца ядзяй вясной у лясах БССР і шырока выгатаўляюцца нарыхтоўчымі арганізацыямі, а таксама спажываюцца насельніцтвам як страва без адпаведнай апрацоўкі.

Гэтыя грыбы ўтрымліваюць атруты ды матэрыі для чалавека, якія могуць выклікаць смяротныя атручванні.

У мэтах папярэджання атручвання ў грыбамі, пастанаўляю:

1. Райздравам і дзяржсанінспектарам гарадоў і раёнаў БССР, а таксама загатоўчым арганізацыям гэтых грыбоў шырока растлумачыць насельніцтву, што ўжыванне гэтых грыбоў магчыма пасля наступнай апрацоўкі: рад гатавання грыбы неабходна разрэзаць на часткі, вымачыць тры дні ў гарачай вадзе на працягу поўгадзіны, адцяжаючы іх пасля кожнай мачкі, пасля чаго добра праварыць або пражарыць.

2. Загатоўчым арганізацыям прапанаваць сезаім загатоўчым пунктам сяло раней чым прыступіць да загатоўкі грыбоў, звязацца з дзяржсанінспекцыяй і райздравам для правядзення сумеснай растлумачальнай работы сярод насельніцтва.

3. Цэнтральнаму дому санкультуры тэрміново выпусціць адпаведную стоўку.

Нам. галоўнага дзяржсанінспектара Б. СЕРКОВ

БЮРО абслугоўвання спажыўцоў электраэнергіі УСП

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА АБАНЕНТАЎ, ЯКІЯ ЗДАЛІ ДА 6 МАЯ ДЛЯ ПРАВЕРКІ

электрашчотчыкі,

ШТО ЯНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ АТРЫМАНЫ ДА 27 МАЯ.

Не атрыманыя шчотчыкі будуць зданы ў склад УСП.

АДМІНІСТРАЦЫЯ.

МЯНЯЮ пакой 22 кв. м. у цэнтры на 2 пакоі або адзін большы.

Даведацца з 9 да 4 гадзін дня па тэлефону 23-786 і з 5 да 9 гадзін вечара — 23-255.

ПРАДАВАЙЦЕ СКАРЫСТАНЫЯ СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ

Да ўвагі БАЦЬКОЎ, школьнікаў

КОГИЗ Бел. аддзел.

Вашы дзеці пераросшы ў другія класы свайёй школы. У іх ёсць дзяцей астарыя, скарыстаныя падручнікі, непатрэбныя больш ім, неабходныя вучням лодшых класаў.

ПРАДАВАЙЦЕ гэтыя падручнікі ў кніжным магазіне і кіёсках КОГИЗ'а па ўстаноўленай расцэнцы.

ЗАПОМНІЦЕ

УСЕ МАГАЗІНЫ І КІЁСКІ КОГИЗ'а КУПЛЯЮЦЬ І ПРАДАЮЦЬ СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ.

Уп. Галоўлітбела № К—2106 Друкарня газеты «Звязды». Менск, Совецкая, 63. К., К., С.